**СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!**
**Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2019 года.**

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
8 СНЕЖНЯ 2018 г. СУБОТА № 237 (28853)



КАЛІ ГАЗЕТЫ БЫЛІ ДАРАЖЭЙ ЗА ЎСЁ 7

## ЛІЧБА ДНЯ

**$7 млрд 439,9 млн**
(у эквіваленце)

*склалі, па папярэдніх даных, міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 снежня 2018 года, паведаміў Нацыянальны банк. За лістапад 2018 года золатавалютныя рэзервы выраслі на $323,3 млн (на 4,7 %) пасля росту ў кастрычніку 2018 года на $181,3 млн (на 2,6 %). Урадам і Нацыянальным банкам у лістападзе выканана знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце на агульную суму каля $150 млн. Згодна з Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі на 2018 год, аб'ём міжнародных рэзервовых актываў на 1 студзеня 2019 года з улікам пагашэння ўрадам Беларусі і Нацыянальным банкам унутраных і знешніх абавязацельстваў у замежнай валюце павінен скласці не менш як $6 млрд.*

# Шакаладны гамбіт



**Аляксандра КАСПЯРОВІЧ, пяцігадовая ўдзельніца турніру:** ***«Гуляць у шакаладныя шахматы цікава. Але было б яшчэ цікавей, калі б знятую фігуру дазволілі з'есці...»***

Незвычайны турнір адбыўся ў Нацыянальным гістарычным музеі. Навучэнцаў Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках чакаў сапраўдны калядны цуд: замест звычайных фігур на шахматных дошках размясціліся шакаладныя пешкі, сланы, коні і ферзі. Але гэта не адзіны сюрпрыз. Зала музея, дзе адбываўся шакаладны шахматна-шашачны турнір, была таксама абстаўлена салодкімі экспанатамі. Жывёлы, агароднiна, нават піяніна — усё гэта выраблена з сапраўднага шакаладу, які, як аказалася, бывае не толькі белы або чорны, але і зялёны, жоўты і нават ружовы. Як расказаў менеджар праекта «Мастацтва шакаладу» Міхаіл Філімонаў, ідэя такіх мерапрыемстваў зарадзілася ў Ганконгу каля шасці гадоў таму. У Беларусі такая выстаўка ладзіцца ўпершыню. Матэрыялам для фігур стала мясцовая сыравіна. Затым з'явілася ідэя зрабіць для дзяцей калядны падарунак, вось і зладзілі шакаладны шахматна-шашачны турнір.

**Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Першую ў Беларусі дзяржаўную карпарацыю плануецца стварыць на базе арганізацый Дзяржаўнага камітэта па маёмасці.



• **У рамках праекта «Крычаў — малы разумны горад. Крычаўскі раён. Развіваемся разам» у 2019 годзе будуць створаны «разумны» дом і «разумная» ферма.**

• У профільных класах аграрнай накіраванасці навучаецца больш за 1,2 тысячы школьнікаў Беларусі.

• **Фотапасткі ў лясах Віцебскай вобласці з пачатку года дапамаглі выявіць 86 парушэнняў.**

• У Івацэвіцкім раёне жыхарка Баранавіч 1974 г. н. на аўтамабілі «Аўдзі» збіла двух ласёў. Жанчыну з траўмамі даставілі ў бальніцу.

ISSN 1990 - 763X
18237

Парламенцкі дзённік

## «ІСТОТЫ, ЗДОЛЬНЫЯ АДЧУВАЦЬ СТРАХ І БОЛЬ»

Дэпутаты сустрэліся з актывісткай, якая патрабуе кардынальных змен у сферы аховы жывёл



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 6

Па сутнасці справы

## У ЗОНЕ НЕБЯСПЕКІ... УРАЧ

### Дапамога патрабуецца не толькі пацыентам

**Міністэрства аховы здароўя зацвердзіла канцэпцыю цэнтраў маніторынгу і прафілактыкі псіхалагічных рызык у прафесійнай дзейнасці медыцынскіх работнікаў. Пілотныя праекты ўжо запушчаны ў Мінску, Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях.**

— Новыя цэнтры будуць размяшчацца на базе сімуляцыйна-атэстацыйных цэнтраў для адпрацоўкі практычных навыкаў медыкаў, якія сёння актыўна развіваюцца пры падтрымцы Сусветнага банка, — расказала журналістам **начальнік упраўлення кадравай палітыкі, устаноў адукацыі Міністэрства аховы здароўя Вольга МАРШАЛКА.** — У 2019 годзе яны адкрыюцца ў 17 медыцынскіх каледжах, у 2020-м — у чатырох профільных ВНУ, а ў 2021—2022 гадах — у Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Пілотны праект павінен дапамагчы адпрацаваць асноўныя напрамкі работы цэнтраў псіхалагічнай падтрымкі і далейшага іх развіцця. Сутнасць навацыі — дапамагчы работнікам сістэмы аховы здароўя ў папярэджванні і вырашэнні розных псіхалагічных праблем, якія ўзнікаюць у іх прафесійнай дзейнасці. Прычым акцэнт робіцца менавіта на прафілактыку. Будуць выяўляць таксама і прафесійныя стрэсары, вывучаць псіхалагічны клімат у калектывах.

СТАР. 4

Блізкая ўлада

# Чыноўнік любога ўзроўню павінен быць даступны

## Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА выслухала жыхароў Навагрудчыны

**На сустрэчу з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта запісалася больш за 30 чалавек з розных рэгіёнаў. Тэмамі для абмеркавання былі як асабістыя пытанні, так і просьбы вырашыць праблемы з будаўніцтвам і эксплуатацыяй жылля, бізнес-аб'ектаў.**



Фота БелТА.

Пенсіянер з Навагрудка звярнуў увагу на пытанні навядзення парадку каля прыватных дамоў, эканоміі і руплівага выкарыстання мясцовых відаў паліва, уключэння ў абарот невыкарыстоўваемых будынкаў і збудаванняў. Падняў пенсіянер і не самую сур'ёзную, на першы погляд, праблему: у некаторых мясцовых установах у санвузлах лілася вада, у памяшканнях, нягледзячы на яркі дзень, гарэла святло. А з падобных дробязяў, лічыць заяўнік, складваюцца вялікія траты.

Наталля Качанава адзначыла, што такія неабыякавыя людзі шмат у чым дапамагаюць падтрымліваць дысцыпліну і парадак. Але і кіраўнікі на месцах не павінны заставацца глухімі да падобных пытанняў, неабходна больш прыслухоўвацца да актыўных жыхароў.

«Мясцовым уладам неабходна сустракацца з жыхарамі раёнаў або гарадоў, даваць справаздачы аб тым, што зроблена, а што не, і па якой прычыне, расказваць, куды накіраваны тыя ці іншыя сродкі. Работа ў такім фармаце павінна быць рэгулярнай», — падкрэсліла яна. Знаходзіць магчымасці для таго, каб сустрэцца з людзьмі, абавязаны не толькі прадстаўнікі выканаўчай улады, але і кіраўнікі арганізацый і прадпрыемстваў. Прычым яны павінны не проста пачуць чалавека, а вырашыць яго пытанне.

Для ініцыятыў ад людзей, грамадскіх арганізацый дзверы гар- і райвыканкамаў павінны быць адкрыты, дадала Наталля Качанава. На прыёме, у прыватнасці, абмяркоўваліся пытанні, звязаныя з правядзеннем Года малой радзімы. На думку тых, хто запісаўся на прыём, важна больш актыўна прыцягваць грамадзян да добраўпарадкавання, навядзення парадку.

«Многія з паднятых сёння пытанняў маглі б быць вырашаныя на месцах. І, калі б людзей пачулі, ім не давялося б ісці на прыём на больш высокі ўзровень», — сказала Наталля Качанава. Яна падкрэсліла, што недапушчальныя такія факты, калі людзі скардзяцца, што не змаглі трапіць на сустрэчу з чыноўнікам у раёне або вобласці.

Звярнуліся па дапамогу да кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта ўдовы воінаў-інтэрнацыяналістаў з Навагрудка. Калісьці іх сем'і атрымалі сацыяльнае жыллё, зараз мужоў няма, а ўдовы і дзеці не могуць прыватызаваць жыллё, ёсць праблемы з паляпшэннем жыллёвых умоў. Пытанне стане тэмай дадатковага абмеркавання. Сітуацыю вывучаць у разрэзе ўсёй краіны.

Дэталёва разбяруцца і з ходам расследавання некаторых крымінальных спраў — з падобнымі просьбамі звярнуліся жыхары з некалькіх рэгіёнаў.

Традыцыйна паступалі пытанні, якія датычацца будаўніцтва і рамонту дарог, функцыянавання ЖКГ. Усе яны стануць тэмай дадатковага разгляду.

**Паводле БелТА.**

Суседзі

# СЯБРОЎСТВА ПРЫГРАНІЧЧА

## Польшча ўдзячна Беларусі за спрашчэнне візавага рэжыму

**Аб гэтым на сустрэчы з журналістамі заявіла Рэната ШЧЭНХ, намеснік міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі Польшчы, адзначыўшы, што польскі бок таксама дэкларуе гатоўнасць да такога кроку для беларускіх грамадзян.**

Сустрэча адбылася ў рамках пасяджэння Беларуска-польскай міжурадавай каардынацыйнай камісіі па справах трансгранічнага супрацоўніцтва. У яе рабоце прынялі ўдзел 42 спецыялісты з дзвюх краін.

Як паведаміў **старшыня камісіі з беларускага боку, намеснік міністра замежных спраў Яўген ШАСТАКОЎ,** сустрэча — адно з ключавых мерапрыемстваў у дыялогу краін для каардынацыі дзейнасці па развіцці прыгранічных рэгіёнаў. Агульная мяжа краін з'яўляецца граніцай ЕС і ЕАЭС, што, па словах Рэнаты Шчэнх, ставіць перад краінамі асаблівыя задачы.

— З моманту правядзення мінулага пасяджэння камісіі ў польскім Аўгустове ў маі 2017 года бакамі было нямала зроблена для ўдасканалення дагаворна-прававых баз двухбаковага супрацоўніцтва. У стадыі падрыхтоўкі да падпісання каля дзесяці дагавораў трансгранічнай тэматыкі, і мы будзем імкнуцца забяспечыць іх рэалізацыю ў найбліжэйшы час, — сказаў Яўген Шастакоў.

Акрамя таго, наша краіна зацікаўлена ў прыцягненні сродкаў з еўрапейскіх фондаў для рэалізацыі перспектыўных праектаў, у тым ліку ў рамках праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча — Украіна — Беларусь 2014—2020».

— Са свайго боку мы на працягу апошніх гадоў паслядоўна спрашчаем парадак уезду на сваю тэрыторыю для грамадзян больш як 80 краін, уключаючы краіны Еўрасаюза і, зразумела, Польшчы, — падкрэсліў намеснік міністра.

Вынікам пасяджэння міжурадавай камісіі стаў пратакол, які будзе праграмным дакументам на наступны год. Паміж краінамі ўжо ажыццяўляюцца праекты па развіцці прыгранічнай інфраструктуры, а гэта пагадненне пасприяе працягу такой дзейнасці.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Актуальна

# ЗАТРАТЫ НА ІНФРАСТРУКТУРУ

## У прыватнай забудове іх павінны вызначаць пры выдачы дазвольнай дакументацыі



**Велічыню затрат на праектаванне і будаўніцтва інфраструктуры, пакрываемых грамадзянамі пры будаўніцтве аднакватэрных жылых дамоў, мясцовыя выканкамы павінны вызначаць пры выдачы дазвольнай дакументацыі на ўзвядзенне дамоў. Аб гэтым карэспандэнту БелТА паведамілі ў Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва, каментуючы дзеянне ўказа № 26 «Аб мерах па ўдасканаленні будаўнічай дзейнасці».**

Згодна з указам, затраты на інфраструктуру павінны пакрываць грамадзяне, якія набылі зямельныя ўчасткі пасля яго ўступлення ў сілу, гэта значыць пасля 1 красавіка 2014 года. Пры гэтым дата ўводу аб'ектаў інфраструктуры не мае значэння. Затраты не пакрываюцца, калі яны ўжо былі ўключаны ў плату за ўчастак, якія набываюцца на аўкцыёнах. Ад пакрыцця сродкаў вызваленыя маючыя патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

Велічыня затрат на інфраструктуру залежыць ад праектнай магутнасці дома. Неабходную для выплаты суму павінны вызначаць мясцовыя выканкамы пры выдачы дазвольнай дакументацыі на будаўніцтва дома. Для яе атрымання трэба звярнуцца ў выканкам з пісьмовай заявай, у якой пазначаюцца параметры, тэхнічныя характарыстыкі будучага дома і інжынерна-тэхнічнага абсталявання.

У Мінбудархітэктуры падкрэслілі, што пры фарміраванні зямельных участкаў для правядзення аўкцыёну кадастравы кошт зямельнага ўчастка павінен быць актуалізаваны з улікам наяўнасці размеркавальнай інжынернай і транспартнай інфраструктуры да зямельных участкаў, выстаўленых на аўкцыён.

Парламенцкі дзённік

# Прэзідэнт Судана наведае Беларусь

**Пра падрыхтоўку да гэтага візіту і яго значэнне ішла размова падчас сустрэчы старшыні Палаты прадстаўнікоў Уладзіміра Андрэйчанкі з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Судан у Беларусі Нурам аль-Даіемам Абд аль-Гадзірам Хамадам аль-Ніелам.**

Уладзімір Андрэйчанка падкрэсліў, што леташні візіт Прэзідэнта Беларусі ў Судан стварыў вельмі добрую аснову для супрацоўніцтва па многіх кірунках. У першую чаргу гэта датычыцца машынабудавання, сельскай гаспадаркі, здабычы карысных выкапняў, а таксама сферы адукацыі, навукі і многіх іншых.

«Маючы адбыцца візіт прэзідэнта вашай краіны ў Беларусь дазволіць намеціць новыя перспектывы нашага супрацоўніцтва, — выказаў упэўненасць Уладзімір Андрэйчанка. — Парламентарыі настроены цалкам у гэтым садзейнічаць».

Летась на ўзроўні кіраўнікоў парламентаў Беларусі і Судана адбыўся абмен візітамі. Сёлета сустрэчы працягнуліся на міжнародных пляцоўках. Паміж ніжнімі палатамі парламентаў падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве, створаны адпаведныя рабочыя групы.

«Усё гэта садзейнічала таму, што ў жніўні мінулага года была падпісана дарожная карта аб супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Суданам, — сказаў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Зараз нам неабходна зрабіць так, каб канструктыўныя палітычныя адносіны адбіліся на канкрэтных выніках гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння».

Нядаўна Беларусь, згодна з дамоўленасцямі, закупіла ў Судана арахіс на мільён долараў для сваіх кандытарскіх фабрык. Пачаліся пастаўкі беларускіх трактароў у гэтую ўсходнеафрыканскую дзяржаву, заключаны кантракт з банкам Судана аб пастаўцы нашай краінай 17 збожжасховішчаў на агульную суму 70 мільёнаў долараў.

«Трэба было б распачаць нейкі сур'ёзны праект, — выказаў пажаданне Уладзімір Андрэйчанка. — Я казаў пра гэта на сустрэчы з прэзідэнтам вашай краіны: давайце створым шматпрофільнае зборачнае прадпрыемства, на якім будуць збірацца трактары «Беларус», грузавыя аўтамабілі, тэхніка «Гомсельмаша», глебаапрацоўчая тэхніка».

У Судане працуе ганаровы консул Рэспублікі Беларусь Мухамед Ісмаіл Мухамед, прэзідэнт групы кампаній MIG, які ўжо рэалізуе беларускую прадукцыю ў сваёй краіне, дапамагае ў арганізацыі яе экспазіцый, і ён гатовы адкрыць такую вытворчасць, сказаў спікер Палаты прадстаўнікоў. Яму толькі патрэбна падтрымка суданскіх улад. Дарэчы, сёлета ў XXXV Хартумскай міжнароднай выстаўцы ўдзельнічалі 20 беларускіх кампаній.

«Калі б мы вырашылі гэтае пытанне, Судан стаў бы пляцоўкай для выхаду Беларусі на ўвесь Афрыканскі кантынент», — лічыць кіраўнік беларускага парламента.

У сваю чаргу, пасол заверыў, што добрыя адносіны, якія склаліся ў Беларусі з Суданам у палітычнай сферы, будуць развівацца, а таксама будуць прагрэсаваць і іншыя кірункі ўзаемадзеяння. «Судан можа стаць для Беларусі стратэгічным партнёрам у Афрыцы. Мая краіна багатая рэсурсамі і мае добрае месцазнаходжанне. З дапамогай беларускіх тэхналогій і навукі мы можам многага дасягнуць», — сказаў ён.

Дыпламат паведаміў, што напярэдадні візіту прэзідэнта яго краіны ў Беларусь рыхтуецца многа сумесных дакументаў для падпісання: у сферах перапрацоўкі прадуктаў, інфраструктуры і фінансаў.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# «ГЕРОЯМ СПЯВАЦЬ ЛЁГКА!»

## Школьнікі з Наваполацка перамаглі ў рэспубліканскім экалагічным конкурсе

**Відэаролік пад назвай «Гэта наш клопат, а не кагосьці!», зняты вучнямі сярэдняй школы № 12 Наваполацка, перамог у рэспубліканскім творчым конкурсе аб карысці асобнага збору смецця «Героям спяваць лёгка!».**




Усяго ў конкурсе ўзялі ўдзел 385 устаноў адукацыі, ад якіх арганізатары атрымалі 406 відэакліпаў. Журы, у якое ўвайшлі спецыялісты па абыходжанні з другаснымі матэрыяльнымі рэсурсамі, кіраўнікі эстрадных студый і прафесіяналы рэкламнай сферы, ацэньвала якасць выканання песні «Каб планету нам ратаваць», арыгінальнасць ідэі, інфарматыўнасць і пераканаўчасць роліка. І хоць напачатку планавалася вызначыць толькі чатырох пераможцаў, з улікам колькасці і якасці дасланых работ былі прызначаны дадатковыя прызавыя месцы. Перамогу па суме балаў атрымалі вучні 4—10 класаў сярэдняй школы № 12 Наваполацка, якія ў сваім роліку з дапамогай дзіцячага хору і каманды супергерояў літаральна за хвіліну проста і даходліва растлумачылі, як зрабіць планету чысцейшай і чаму кожнаму вострa неабходна пачаць сартаваць смецце. Наогул, Віцебшчына стала самай актыўнай на конкурсе — адсюль прыйшло 105 ролікаў.

2—4-е месцы занялі «Дзіцячы сад — пачатковая школа № 2» Брэста, школа № 33 Магілёва і школа № 2 Стоўбцаў. Уладальнікі першых двух месцаў атрымаюць ад арганізатараў камплекты музычнага абсталявання для школы, два другія прызёры — мультымедыйныя праектары. Урачыстае ўзнагароджанне пераможцаў пройдзе ў Наваполацку да 17 снежня, прычым галоўны прыз уручыць уласна супергерой Экамен, які натхняў дзяцей і настаўнікаў. Таксама навучэнцы школ-пераможцаў атрымаюць спецыяльныя экалагічныя наборы ад янотаў — персанажаў вядомых рэкламных ролікаў аб сартаванні смецця. Акрамя таго, дадатковыя прызы будуць уручаны школам з Дуброўна, Гродна, Гомеля, Магілёва, Пружан, вёскі Новае Поле (Мінскі раён), якія арганізатары адзначылі за крэатыў і арыгінальнасць.

«Педагогі і дзеці выканалі вялізную работу, — адзначыла **старшыня конкурснай камісіі, дырэктар ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Наталля ГРЫНЦЭВІЧ.** — Усе відэакліпы атрымаліся цікавыя: гэта і школьныя спектаклі, і міні-фільмы, і кліпы з уласнай аранжыроўкай, і выступленні пад жывы акампанемент, і спевы на беларускай мове. А галоўнае — усім удзельнікам удалося данесці да гледачоў асноўную ідэю конкурсу, што збіраць смецце асобна і правільна павінен кожны з нас, каб захаваць навакольнае асяроддзе і якасць уласнага жыцця».

Усе конкурсныя ролікі даступныя для прагляду на YouTube-канале «Героям спяваць лёгка».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

## Я зноў выбіраю «Звязду»

### «ЛЮБЛЮ ЗА ПРЫГОЖУЮ РОДНУЮ МОВУ»

Звязда. Да чытача з любоўю!



**Алена СЛІЧОНАК, дырэктар сярэдняй школы № 2 г. Глуска:**

— Перыядычна выпісваю «Звязду» з канца 80-х, але часцей куплю яе ў кіёску. У любым выпадку ўсё, што друкуецца на яе старонках, адсочваю рэгулярна. Такой вернасці ў мяне няма ні да адной іншай газеты. Добра памятаю яшчэ той час, калі «Чырвоная змена», якая зараз выходзіць у складзе «Звязды», карысталася неверагодным папулярнасцю ў школьнікаў, і яе шмат хто выпісваў. Сёння моладзь таксама чытае, праўда, часцей за ўсё ў інтэрнэце. Але, мне здаецца, у любога чалавека перыядычна ўзнікае жаданне ўзяць у рукі «жывую» газету і пагартаць яе. Гэтыя стасункі ніколі не заменіць інтэрнэт.

«Звязда» падабаецца за выразнасць і даступнасць інфармацыі, за прыгожую родную мову. Мне, як гісторыку, цікавы яе гістарычны складнік. Шмат чаго з гэтага матэрыялу можна выкарыстоўваць як на ўроках, так і ўвогуле ў жыцці. А яшчэ вельмі люблю звяздоўскія карысныя парады. У мяне свой дом, і я з задавальненнем бяру на ўзбраенне ўсё, што датычыцца хатняй гаспадаркі. «Звязда» — адна з маіх любімых газет, і я спадзяюся, што ў будучым на яе старонках з'явіцца яшчэ болей артыкулаў пра цікавых людзей, папулярныя музычныя гурты. Гэта ўсё ёсць, але хочацца, каб было болей.

## Адукацыя на адлегласці

# УСЁ ПРА МІФАЛОГІЮ І КУХНЮ

## Чаму вучыць этнаакадэмія?

**Як даведацца больш пра нацыянальную культуру не выходзячы з дому? Як падабраць сапраўдны народны строй, а не псеўдавышыванку? Што трэба ведаць пра нацыянальную кухню? На гэтыя і многія іншыя пытанні вы зможаце атрымаць адказы, калі запішацеся ў этнаакадэмію.**

У Еўропе ўсё большую папулярнасць набываюць так званыя народныя ўніверсітэты, дзе дарослыя людзі могуць атрымліваць дадатковую адукацыю на працягу ўсяго жыцця. Віртуальныя студэнты слухаюць відэалекцыі, выконваюць тэставыя заданні, адказваюць на пытанні і атрымліваюць балы. І хоць слухачам народных універсітэтаў не выдаюць дыпломаў, веды, засвоеныя такім чынам, могуць быць даволі карысныя, тым больш што ў сеціва трапляюць у тым ліку і відэазапісы лекцый выкладчыкаў з класічных універсітэтаў.

Дзякуючы Студэнцкаму этнаграфічнаму таварыству падобны кантэнт з'явіўся і ў Беларусі. Праект «Этнаакадэмія: анлайн-курсы па этнаграфіі, народных рамёствах і народным мастацтве» дазволіць больш даведацца пра нашу культуру. Ужо знята 150 урокаў, і, як запэўніваюць арганізатары, работа ў гэтым кірунку будзе працягнута.

Дзякуючы гэтаму праекту ахвотныя змогуць засвоіць восем курсаў, якія будуць выкладацца ў інтэрнэт паступова. Самы першы прысвечаны беларускай міфалогіі. Яго аўтар — кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і Сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ Зміцер Скварчэўскі паспрабуе пазмагацца са стэрэатыпамі, якія склаліся ў адносінах да беларускай міфалогіі. Гэта актуальна, бо, на жаль, экскурсаводы, блогеры, гаспадары агрaсядзіб часта выкарыстоўваюць недакладную ці нават скажоную інфармацыю пра беларускіх міфічных істот.

Таксама ў этнаакадэміі будуць курсы, якія раскажуць пра беларускі драўляны посуд, традыцыйнае вяселле, народны строй, беларускую кухню... Не разлічвайце, што тут адразу навучаць шыць ці гатаваць. Пакуль аўтары курсаў знялі толькі «тэарэтычныя» ролікі (але ў будучым плануюць зрабіць і практычны дадатак). Затое вы навучыцеся ацэньваць рэчы, якія бачыце на кірмашах, адрозніваць добрую кашулю і шырспажыў. Курс, прысвечаны нацыянальнай кухні, не забяспечыць рэцэптамі, але ён будзе карысны гаспадарам агрaсядзіб, людзям, якія працуюць у пунктах харчавання, тым больш што яго ў этнаакадэміі выкладае аўтар «гастранамічных» кніжак Алесь Белы, у якога гісторый пра розныя стравы набярэцца пад сотню. Алесь упэўнены, што выкарыстанне этнаграфічных звестак будзе заахвочваць людзей цікавіцца нацыянальнымі стравамі і напоямі. А без такога інтарэсу на сучасным рынку цяжка прадаць нацыянальныя прадукты. Важна, каб такія веды падаваліся ў прафесійнай адукацыі кухараў, тэхнолагаў, улічваліся пры распрацоўцы меню рэстаранаў, пры стварэнні новых страў.

Этнаакадэмія адкрыта для ўсіх, заняткі ў ёй бясплатныя — яны размешчаны на MOOC-платформе stepik.org.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# БУСЕЛ ПРЫЛЯЦЕЎ!

## Тэлевядучыя Тэа і Вольга Рыжыкава сталі бацькамі



Пра тое, што гэты сімпатычны дуэт — не толькі сувядучыя ў рэйтынгавай праграме «Добрай раніцы, Беларусь!», але і сямейная пара, здаецца, не ведаў толькі лянівы. Але свой стан Вольга не афішавала да апошняга, па-ранейшаму выходзячы ў прамы эфір. Цяпер жа ў тэлевізійным жыцці сям'і — радасны перапынак: 5 снежня ў іх нарадзілася дачка.

Пільныя гледачы, мабыць, ужо заўважылі, што за апошнія некалькі дзён у праграме «Добрай раніцы, Беларусь!» адбыліся пэўныя перастаноўкі. Так, Тэа (Юрыя Вашчука) і Вольгу Рыжыкаву на час водпуску замяняе дуэт вядучых Андрэя Макаёнка (ён знаёмы гледачам па праектах «Тэлераніца» і «Макаёнка, 9») і Надзеі Цімафеевай, а ў пары з Глебам Давыдавым ранішні эфір зноў вядзе Ксенія Фаміч-Дзюкава, якая часова не была задзейнічана ў праекце ў сувязі з нараджэннем і выхаваннем сына.

Як расказалі «Звяздзе» ў Белтэлерадыёкампаніі, цяпер яны будуць вар'іравацца ў кожным выпуску: «У праграмы, якая выходзіць больш за 20 гадоў, настолькі зладжаны калектыў, што кожны з «рулявых эфіру» гатовы працаваць у тандэме з любым з калег».

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота прадстаўлена БТРК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### ААН: да канца года колькасць карыстальнікаў інтэрнэту ўпершыню перавысіць палову насельніцтва Зямлі

Чалавецтва зрабіла важны крок на шляху да інклюзіўнага інфармацыйнага грамадства — да канца 2018 года ў свеце будзе больш за 3,9 млрд карыстальнікаў інтэрнэту, гэта значыць, больш за палову насельніцтва планеты. Пра гэта заявіў у пятніцу ў Жэневе Міжнародны саюз электрасувязі (МСЭ), які з'яўляецца спецыялізаванай установай ААН.

«Паводле ацэнак МСЭ, да канца 2018 года 51,2 % насельніцтва Зямлі, ці больш за 3,9 млрд чалавек, будуць карыстальнікамі інтэрнэту», — гаворыцца ў паведамленні. Як адзначыў у сувязі з публікацыяй гэтых звестак генеральны сакратар МСЭ Хаулінь Чжаа, у канцы года будзе пройдзены 50-працэнтны парог у выкарыстанні сусветнага сеціва, і гэта «ўяўляе сабой важны крок у напрамку больш інклюзіўнага глабальнага інфармацыйнага грамадства». Разам з тым, ён звярнуў увагу на той факт, што ў свеце ўсё яшчэ шмат людзей, якія зусім не маюць магчымасці карыстацца дасягненнямі лічбавай эканомікі.

### Ва ўрадзе Францыі лічаць, што радыкалы хочуць звергнуць уладу з дапамогай «жоўтых камізэлек»



Радыкалы спрабуюць з дапамогай руху «жоўтых камізэлек» скінуць уладу ў Францыі. Такое меркаванне выказаў у інтэрв'ю газеце Le Parisien афіцыйны прадстаўнік урада Францыі Бенжамен Грыво.

Каментуючы прызначаную на 8 снежня чарговую акцыю пратэсту недалёка ад Елісейскага палаца, Грыво сказаў: «Палітызаваныя і радыкальныя элементы спрабуюць выкарыстоўваць рух. Яны хочуць скінуць уладу».

Прадстаўнік урада выказаў занепакоенасць тым, што падчас маніфестацый «можа распаўсюджвацца агнястрэльная зброя». «Падчас акцый пратэсту ўжо загінулі чатыры чалавекі, сотні былі параненыя», — адзначыў ён. Грыво параіў не ўдзельнічаць у суботніх пратэстах у Парыжы. «Гэта — парада, якую я хачу даць», — сказаў ён, папярэдзіўшы, што «на напады падчас пратэстаў будзе дадзены сувымерны і рашучы адказ».

### Новы максімум сонечнай актыўнасці прыйдзецца на 2022—2023 гады

Пік новага, 25-га па ліку з часу пачатку назіранняў, цыкла сонечнай актыўнасці прыйдзецца на 2022—2023 гады. Такой ацэнкай падзяліўся з ТАСС галоўны навуковы супрацоўнік Пулкаўскай абсерваторыі Юрый Нагавіцын.

Раней СМІ апублікавалі прагноз аналітыкаў, у якім эксперты ацанілі найгоршы з магчымых сцэнарыяў развіцця сусветнай эканомікі ў 2019 годзе. У ім, у прыватнасці, гаварылася, што з запускам 25-га цыкла сонечнай актыўнасці адбудзецца наймацнейшая сонечная бура, якая знішчыць спадарожнікі з боку Заходняга паўшар'я. Гэта, у сваю чаргу, па ацэнкі аналітыкаў, прывядзе да хаосу ў залежных ад GPS сферах і страт амаль у $2 трлн.

«Што датычыцца пачатку сонечнага цыкла, то ён можа пачацца ў 2019 годзе, але, хутчэй за ўсё — у 2020 годзе. Гэта будзе толькі пачатак сонечнага цыкла, і вялікіх геамагнітных узрушэнняў, выкліканых сонечнай актыўнасцю, чакаць не даводзіцца. Максімум сонечнага цыкла, калі магутныя ўспышкі на сонцы сапраўды магчымыя, прыйдзецца дзесьці на 2022—2023 гады», — сказаў ТАСС Юрый Нагавіцын.

# У ЗОНЕ НЕБЯСПЕКІ... УРАЧ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Ветлівасць, павага і талерантнасць

Як вядома, з сярэдзіны кастрычніка пачалі дзейнічаць новыя Правілы медыцынскай этыкі і дэанталогіі, замацаваныя ў адпаведнай пастанове Міністэрства аховы здароўя. Праект гэтага дакумента выносіўся на грамадскае абмеркаванне, паколькі ён закранае інтарэсы вельмі многіх: і тых, каму аказваецца медыцынская дапамога, і тых, хто аказвае гэту дапамогу.

**«У кожнага ўрача і медыцынскай сястры ў перспектыве з'явіцца асабісты электронны кабінет».**

Зацверджаныя нормы медыцынскай этыкі і дэанталогіі змяшчаюць пералік асноўных маральна-этычных нормаў паводзін медыцынскіх работнікаў, нормы ўзаемаадносін медработнікаў з пацыентамі і калегамі, работнікамі іншых органаў і арганізацый. У прыватнасці, медработнікі павінны прытрымлівацца такіх прынцыпаў, як ветлівасць, гуманнасць, дэмакратычнасць, давер, міласэрнасць, стрыманасць, спачуванне, справядлівасць, павага і талерантнасць. Медыкам неабходна праяўляць разуменне і цярплівасць да пацыентаў, паважаць іх погляды і перакананні. Нельга дапускаць дыскрымінацыі па рэлігійных, нацыянальных і іншых прыкметах. Медработнікі павінны стрымліваць свае эмоцыі, быць тактоўнымі, у даступнай і зразумелай для пацыента форме інфармаваць яго аб характары і мэтах планаванага лячэння, асаблівасцях прымянення тых ці іншых лекавых сродкаў, вырабах медыцынскага прызначэння, магчымых пабочных эфектах, расказваць пра альтэрнатывы гэтаму лячэнню. Акрамя таго, хуткая медыцынская дапамога павінна аказвацца медработнікамі (у межах іх магчымасцяў) людзям, якія маюць у ёй патрэбу, і па-за сценамі ўстаноў аховы здароўя. Выпадкі парушэння гэтых нормаў будуць разглядацца камітэтамі (камісіямі) па пытаннях медыцынскай этыкі і дэанталогіі, камісіямі па супрацьдзеянні карупцыі, якія працуюць у арганізацыях аховы здароўя.

## Узяць чужы боль

— Часцей за ўсё мы кажам пра дапамогу пацыентам, але дапамога патрабуецца і ўрачам. Трэба навучаць іх бесканфліктным зносінам, навыкам самарэгуляцыі, як правільна выходзіць са стану стрэсу. Нашы цэнтры якраз і будуць займацца гэтымі пытаннямі, там будуць працаваць прафесійныя псіхолагі, праводзіцца адпаведныя трэнінгі, — падкрэслівае **старшы выкладчык кафедры грамадскага здароўя і аховы здароўя БелМАПА Дзіна МАРЧАНКА-ЦЯБУТ.** — Калі мы кажам пра прафесійныя рызыкі, то ў першую чаргу маем на ўвазе ўзнікненне сіндрому эмацыянальнага выгарання. Гэта могуць быць і развіццё цынізму, і маманты, якія ў псіхалогіі называюць рэдукцыяй прафесійных абавязкаў (спробы скараціць прафесійныя абавязкі, якія вымагаюць эмацыянальных выдаткаў). Хвораму чалавеку страшна, балюча, незразумела... З такімі людзьмі трэба ўмець працаваць, і калі ўрач бярэ ўвесь боль на сабе, то дапамога спатрэбіцца ўжо яму.

**«У сацыяльных сетках нельга размяшчаць фота і відэа любых медыцынскіх маніпуляцый з пацыентамі».**

— Работа медыцынскага персаналу — гэта пастаяннае знаходжанне ў тым ці іншым стрэсавым стане, таму што абсалютная большасць людзей звяртаецца са сваімі праблемамі. Хвароба цягне не толькі фізічныя, фізіялагічныя парушэнні, але і псіхалагічныя праблемы, таму што чалавек адчувае дыскамфорт, — разважае **старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Дзмітрый ШАЎЦОЎ.** — І пацыент мае права патрабаваць да сябе асаблівага стаўлення і ўвагі. Доктар павінен разабрацца, што з ім адбылося, настроіць яго на пазітыўны лад, устанавіць, як мы кажам, тэрапеўтычны кантакт — дабіцца поўнага ўзаемадзеяння з пацыентам, каб разам справіцца з яго хваробай. Таму нашы медыцынскія работнікі павінны быць падрыхтаванымі. Той курс, які выкладаецца ў медуніверсітэтах, закладвае базіс, але гэта тэорыя. Зусім іншая справа, калі студэнт становіцца ўрачом і атрымлівае ўласны досвед стасункаў з пацыентамі, шляхам спроб і памылак малады спецыяліст спрабуе выбудаваць сваю мадэль паводзін. Вельмі важна дапамагчы нашым калегам знайсці падыход да кожнага пацыента, таму дапамога патрабуецца ім і на ўзроўні постдыпломнай падрыхтоўкі.

## Медыкі — у сацыяльных сетках

Вольга Маршалка паведаміла, што ўвесь змест пастановы «Аб зацвярджэнні Правіл медыцынскай этыкі і дэанталогіі» быў пакладзены ў аснову службовых інструкцый і ўсіх медыцынскіх работнікаў азнаёмілі з гэтым дакументам пад роспіс. Дэталёвага апісання знешняга выгляду работнікаў у пастанове не змяшчаецца, але гэтыя пытанні прапісаны ў правілах унутранага працоўнага распарадку ўстаноў аховы здароўя.

— Вонкавы выгляд медыцынскага работніка павінен быць эстэтычным і не перашкаджаць яму выконваць яго службовыя абавязкі, — тлумачыць Дзмітрый Шаўцоў. — Паверце, што бясшумны абутак без абцасаў — гэта клопат як пра нашых калег, так і пра пацыентаў, бо калі медработнік атрымае траўму на рабочым месцы, то пад пагрозай можа аказацца і жыццё пацыента. Даўжыня халата ў нас нідзе не прапісана, але ж усім зразумела, што можа выклікаць незадавальненне ў хворых людзей. Паўпразрысты халат, апрануты на іншае адзенне, будзе дарэчы хіба што толькі ў рэнтген-кабінеце ці ў рэгістратуры. Увогуле, сёння няма праблем з тым, каб выглядаць прыгожа і сучасна. Мы, на шчасце, адышлі ад бавоўняных халатаў, якія страчвалі свой выгляд амаль імгненна: ёсць і добрыя тканіны, і зручныя медыцынскія касцюмы... Макіяж таксама не павінен быць кідкім, як і шлейф ад парфумы, бо ў кагосьці можа быць алергія на пэўныя пахі...

А на што маюць права медыцынскія работнікі ў сацыяльных сетках? У іншых краінах былі выпадкі, калі пасля з'яўлення пэўных здымкаў у сеціве, якія выкладалі медыцынскія работнікі, апошнія страчвалі месца працы. (Ну як, напрыклад, ставіцца да эратычных здымкаў на аперацыйным стале?) Былі і флэшмобы, арганізаваныя медыкамі, у падтрымку сваіх калег, калі тыя рабілі сэлфі на сваім рабочым месцы і дзяліліся імі ў інтэрнэце.

— У сацыяльных сетках нельга размяшчаць фота і відэа любых медыцынскіх маніпуляцый з пацыентамі: ні падчас прыёму, ні падчас аперацыі. Гэта табу, таму што ўсё, што датычыцца пацыента, складае ўрачэбную тайну, — падкрэслівае Дзмітрый Шаўцоў. — Дзяліцца падобнымі фота і відэа медыкі могуць толькі з калегамі выключна ў прафесійных мэтах. Таксама недапушчальна, каб медработнікі ў сацыяльных сетках размяшчалі фота з п'яных вечарынак, таму што ўрач у стане алкагольнага ап'янення або з цыгарэтай ніяк не ўпісваецца ў пастулаты здаровага ладу жыцця. Што датычыцца іншых асабістых фота і відэа, то ёсць свабода самавыяўлення, гэта асабістая справа кожнага. Калі медык лічыць, што ён можа выкласці, напрыклад, фота ў купальніку пад пальмай, дык што тут такога?

## Рэйтынг у электронным кабінеце

Вольга Маршалка расказала, што ў рамках развіцця электроннай аховы здароўя плануецца арганізаваць персаніфікаваны ўлік усяго медперсаналу краіны. Мяркуецца, што ў кожнага ўрача і медыцынскай сястры ў перспектыве з'явіцца асабісты электронны кабінет. Ён будзе напаўняцца інфармацыяй, карысная як для іншых калег і кіраўнікоў сістэмы аховы здароўя (напрыклад, для патэнцыйных наймальнікаў), так і для пацыентаў, якія хочуць больш даведацца пра спецыяліста, да якога іх накіроўваюць. Прычым апошнія змогуць пакінуць там свой водгук: выказаць падзяку або, наадварот, — пакінуць крытычную заўвагу. Так будзе фарміравацца рэйтынг кожнага медыцынскага работніка.

— Мяркую, што спецыяліст, які хвалюецца за свой статус, проста не дапусціць, каб нейкі кампрамат трапіў у сеціва, — разважае Вольга Маршалка. — Гэта будзе стымулам для таго, каб выконваць нормы этыкі не толькі на рабочым месцы, але і за сценамі медыцынскай установы. Наша прафесія ва ўсіх навідавоку, таму трэба клапаціцца пра свой імідж.

**«Той курс, які выкладаецца ў медыцынскіх універсітэтах, закладвае базіс, але гэта тэорыя. Зусім іншая справа, калі студэнт становіцца ўрачом».**

— Да таго ж пацыент, напрыклад, можа задаць пытанне ўрачу: «А чаму, доктар, у вас 25 гадоў працоўнага стажу і толькі другая катэгорыя?» — дапаўняе калегу Дзмітрый Шаўцоў. — А такія выпадкі таксама бываюць. Беларуская асацыяцыя ўрачоў зараз праводзіць пробнае інтэрнэт-галасаванне. Устаноўлены фільтры, каб не дапусціць маніпуляцый, і мы правяраем літаральна кожны водгук — ці рэальны чалавек яго пакінуў? І цікавую сітуацыю назіраем. Менавіта ад нас кіраўнікі медыцынскай установы даведваюцца, што ў таго ці іншага іх спецыяліста ўжо ёсць пэўны рэйтынг. І чуем: «А чаму менавіта гэты доктар? У нас жа ёсць і больш дастойныя!» Мы кажам: «Гэта вы так думаеце, а ў пацыентаў ёсць сваё меркаванне». Здаецца, што наперад вырываецца малады доктар. Мы цалкам падтрымліваем ідэю электронных кабінетаў, бо будзе створана канкурэнтнае асяроддзе, ніхто не захоча быць аўтсайдарам. Павышэнне кваліфікацыі, замежныя стажыроўкі — усё гэта, канешне, вельмі важнае для медыцынскага работніка, але прафесіяналізм — гэта яшчэ і чалавекалюбства, уменне знайсці падыход да кожнага пацыента, падабраць патрэбныя словы. Дасягнуць станоўчага выніку ў лячэнні можна толькі ў тандэме...»

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Харчовая бяспека

# Збожжа дакупяць за мяжой, выключна фуражнае

### Прыкладна 600—700 тысяч тон

**Пра гэта паведаміў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Уладзімір ГРАКУН у прэс-цэнтры БЕЛТА.**

Ён удакладніў, што сельскагаспадарчыя прадпрыемствы недаатрымалі каля 1,8 млн тон збожжа да ўзроўню мінулага года. «Хачу адзначыць, што мы цалкам забяспечаны харчовым збожжам, а значыць, і мукой, крупамі, хлебабулачнымі вырабамі. Закупляць збожжа за мяжой могуць, напрыклад, птушкакомплексы. З улікам таго, што ў нас ёсць дзяржаўны рэзерв, плануецца закупіць каля 600—700 тысяч тон нехарчовага збожжа», — сказаў Уладзімір Гракун.

Намеснік міністра адзначыў, што закупкі будуць праводзіцца на конкурснай аснове. «Прадпрыемствы, якія будуць закупляць збожжа, павінны правесці конкурсы і вызначыцца па найбольш выгадных цэнах для краіны. Не выключана, што вобласці будуць праводзіць цэнтралізаваныя конкурсы. Будзем закупляць у тых, хто прапануе найменшую цану і найлепшыя ўмовы. Гэта могуць быць розныя краіны, у тым ліку Расія і Украіна», — сказаў Уладзімір Гракун.

Як вядома, пачатак сёлетняга лета выдаўся найбольш засушлівым. Па звестках Белгідрамета, сярэдняя тэмпература паветра па краіне склала плюс 16,9 градуса, што вышэй за кліматычную норму на 3,5 градуса. Такі цёплы май адзначаны ўпершыню за ўвесь перыяд назіранняў. А за першую дэкаду чэрвеня ў сярэднім па краіне выпала толькі 10 % ад нормы ападкаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Хаўруснікі абакралі знаёмага

### Пацярпелы даведаўся пра гэта ад міліцыянераў

**Супрацоўнікі Цэнтральнага РУУС сталіцы за знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення затрымалі двух мужчын, у якіх пры сабе меўся ноўтбук.**

Міліцыянеры высветлілі, што гэта тэхніка была ўкрадзена ў 34-гадовага знаёмага хаўруснікаў. Прыехаўшы дадому да пацярпелага, аператыўнікі таксама ўстанавілі факт крадзяжу ў яго 100 рублёў. Пра тое, што ён страціў маёмасць і грошы, мужчына даведаўся ад супрацоўнікаў міліцыі. Аказалася, крадзеж адбыўся, калі двое знаёмых былі ў яго ў гасцях, паведамілі ў Цэнтральным РУУС г. Мінска.

У дачыненні да 38-гадовага і 42-гадовага жыхароў сталіцы заведзена крымінальная справа. Ім пагражае пакаранне ў выглядзе папраўчых работ на тэрмін да двух гадоў ці арышту, або абмежавання волі на тэрмін да чатырох гадоў, або пазбаўлення волі на той жа тэрмін.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!

ОТЧЕТ
О ПРОВЕДЕНИИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ
«ПОКУПКА УДАЧИ 3.0»

**Место и дата составления отчета:**
10.12.2018 г.
г. Минск, пр-т Независимости, 11/2, офис 328.
1. Организатор: частное предприятие «Голден Медиа Компани», УНП 691751128. Юридический адрес: 223610, Минская область, г. Слуцк, ул. Ленина, 195А, офис 5.
2. Наименование рекламной игры – «Покупка удачи 3.0».
3. Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3338 от 30.07.2018 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь
4. Срок начала рекламной игры: 15 августа 2018 г.
Срок окончания рекламной игры: 14 декабря 2018 г
5. Количество участников рекламной игры: 9 933 участников.
6. Призовой фонд разыгран полностью.
7. Победители рекламной игры: главный приз 15 000,00 рублей.
Победитель – Алексеюк Александр Михайлович, г. Кобрин, и 1 000 (одна тысяча) победителей. Каждый победитель выиграл денежный приз в размере 100,00 (сто) белорусских рублей 00 копеек.
Список победителей находится на сайте ОАО «Белгазпромбанка», www.belgazprombank.by, в разделе «Новости».
8. Для справок по вопросам проведения рекламной игры, тел. +375 17 209-90-03.
9. В ходе проведения рекламной игры нарушений допущено не было. Жалоб организатору и комиссии не поступало.
Директор ЧП «Голден Медиа Компани» Кухарчик Е. Н.

# ПОШТА ДАСТАВІЦЬ ВІНШАВАННІ

**У навагоддзе, дзякуючы ёй, можна на некалькі хвілін перанесціся ў казку.**



Надоечы, у круглай зале мінскага Галоўпаштамта з'явілася незвычайная паштовая скрыня. З яе дапамогай можна адправіць святочны ліст са сваімі віншаваннямі, марамі і жаданнямі проста Дзеду Марозу і Снягурачцы. Навагоднія пасланні будуць дастаўляцца непасрэдна ў рэзідэнцыю Дзеда Мароза.

Каб ліст дайшоў своечасова, трэба правільна ўказаць адрас. Пасланні ахвотных аддацца эпісталярнаму жанру чакаюць у вёсцы Каменюкі Брэсцкай вобласці — рэзідэнцыя знаходзіцца ў Белавежскай пушчы. Паштовы індэкс — 225063.

Але для таго, каб даслаць ліст улюбёным казачным персанажам, зусім неабавязкова ехаць у Мінск. Лісты, адрасаваныя ім, прымаюцца ва ўсіх паштовых аддзяленнях Беларусі. Разам з тым трэба не адкладваць гэта «на потым» — непасрэдна ў апошнія дні адыходзячага года ў Белавежскую пушчу адпраўляецца вельмі шмат лістоў, і Дзед Мароз рызыкуе фізічна не паспець прачытаць усе пасланні.

Дарэчы, у той жа круглай зале Галоўпаштамта арганізавана сапраўдная навагодняя фотазона. Маленькіх наведвальнікаў там штодня чакаюць Дзед Мароз і Снягурка. Па просьбе бацькоў яны могуць уручыць хлопчыкам і дзяўчынкам загадзя падрыхтаваныя падарункі і павіншаваць з Новым годам. Але нават без папярэдняй дамовы малыя могуць пагутарыць з персанажамі казак, расказаць ім вершык, казку і сфатаграфавацца на памяць.

Дзед Мароз і Снягурка дзяжураць на галоўпаштамце па дзве гадзіны штодня. Па панядзелках, серадах і пятніцах — зранку, з 10 да 12 гадзін. У аўторак і чацвер яны заступаюць на вахту а 17-й гадзіне. Чакаць дзяцей яны будуць і зранку ў дзве суботы — 15 і 29 снежня.

— Найлепшыя фотаздымкі, апублікаваныя ў сацыяльных сетках пад хэштэгамі #белпочта і #belpost, трапяць у нашы афіцыйныя паблікі, — кажа **прэс-сакратар РУП «Белпошта» Алена АРЛОВА.**



Навагодняя тэматыка прысутнічае і на паштовай прадукцыі. У продаж ужо паступіў вялікі асартымент адкрытак і картак, на якіх змешчаны выявы, прысвечаныя навагодняй і калядай тэматыцы. Яркія і арыгінальныя паштоўкі змогуць стаць выдатным дадаткам да падарунка, прыемным знакам увагі і любові блізкім і сябрам, калегам і дзелавым партнёрам. Беларуская пошта вырабляе адкрытачную прадукцыю з 1993 года і за гэты час дасягнула многіх тэхналагічных вяршынь.

— Для нас стала добрай традыцыяй штогод распрацоўваць калекцыю паштовак, картак, канвертаў навагодняй і калядная тэматыкі, — працягвае Алена Арлова. — У гэтым годзе мы прапануем нашым кліентам больш за 80 сюжэтаў паштовай прадукцыі. Разлічваем, што кожны з іх знойдзе свайго пакупніка. Што адлюстравана на нашых паштоўках? І традыцыйныя выявы Дзеда Мароза, Снягуркі і кампазіцыі з выявамі ёлачных цацак, гадзіннікаў, белых мішак на лёдзе.

Нашы паштоўкі сталі прыгажэйшыя. Справа ў тым, што кожны дызайн дэталёва прапрацоўваецца з улікам тэхнічных магчымасцяў беларускіх паліграфічных прадпрыемстваў. Мы шырока выкарыстоўваем паслядрукаваныя тэхналогіі. Гэта пластызоль белага і жоўтага колеру, цісненне гладкай каляровай і тэкстурнай фольгай, тэрмапад'ём... Такім чынам, у век інтэрнэту і СМС мы імкнёмся зрабіць так, каб паштоўка атрымала свой унікальны стыль і скіраванасць. Таму што гэта для кожнага чалавека крыху больш, чым проста прамавугольнік з прыгожай карцінкай. Нават у век хуткаснага інтэрнэту асноўная функцыя паштоўкі — прыносіць радасць, жывыя эмоцыі, пачуцці — не змянілася.

Навагодняя і калядная паштовая прадукцыя застанецца ў продажы і ў першыя дні 2019 года. Купіць яе можна як на галоўпаштамце, так і ва ўсіх аддзяленнях паштовай сувязі Беларусі і ў інтэрнэт-краме shop.belpost.by.

Гэта сапраўды проста: прыйсці ў аддзяленне паштовай сувязі, выбраць прыгожую паштоўку і канверт, напісаць добрыя, цёплыя словы, а беларуская пошта своечасова даставіць ваша віншаванне!

«Белпошта» таксама нагадвае пра тое, што працягваецца акцыя «Віншаванне Дзеда Мароза». З яе дапамогай можна заказаць ліст ад чараўніка, які будзе змяшчаць не толькі прыгожую паштоўку са святочным віншаваннем, але і наборы, якія дапамогуць стварыць непаўторную навагоднюю атмасферу, — гірлянду, ёлачныя цацкі, казачныя маскі і нават вінтажныя наклейкі. Па Беларусі паслуга каштуе 8,5 рубля. За 23 рублі дадаткова дашлюць яшчэ і мяккую цацку — сімвал надыходзячага года парасяці Вачасціка. Заказаць прыемны сюрпрыз для дзяцей можна да 23 снежня ў любым паштовым аддзяленні, з дапамогай спецыяльнага інтэрнэт-сэрвісу «Віншаванне Дзеда Мароза» і нават у паштальёна.

— Атрымлівайце падарунак ад Дзеда Мароза, фатаграфуйцеся з Вачасцікам і выкладвайце фота ў «Інстаграм», суправаджаючы яго хэштэгам #прынесу_удачу! — заклікае Алена Арлова. — Самыя яркія фотаздымкі мы размесцім на нашым сайце і ў акаўнтах у сацыяльных сетках.

А яшчэ ў кожнага чалавека ёсць магчымасць зрабіць адну невялікую, але вельмі добрую справу. З 2014 года Белпошта праводзіць акцыю «Падары дзіцяці радасць». Кожны ахвотны можа аформіць падпіску на газеты і часопісы, адрасаваўшы выданне аднаму з дзіцячых дамоў. За гэты час да акцыі далучыліся тысячы неабыякавых людзей. Аформіць падпіску можна як анлайн, так і ў любым паштовым аддзяленні.

## Палесціна ўступіць у Сусветны паштовы саюз?

**Прэзідэнт Палесціны Махмуд Абас падпісаў дакументы для ўступлення ў Сусветны паштовы саюз. Пра гэта паведамляе палесцінскае агенцтва Wafa. Падпісаныя дакументы афіцыйна прадстаўлены адпаведнаму агенцтву ААН, пратаколам і канвенцыям.**

Раней Злучаныя Штаты неаднаразова звярталіся да ўлад Палесціны з просьбай не ўступаць у якія-небудзь агенцтвы ААН. Амерыканская какадаўства патрабуе ад афіцыйнага Вашынгтона спыніць фінансаванне любой структуры пры ААН, якая нададасць палесцінцам поўнае членства.

## Пасылкі ў Канаду дойдуць са спазненнем

**У канцы лістапада па просьбе аператара Canada Post РУП «Белпошта» часова прыпыніла прыём лістоў, пасылак і адпраўленняў міжнароднай паскоранай пошты ў Канаду. Гэта было звязана з забастоўкамі ў розных абласцях паўночнаамерыканскай краіны. Як вынік — узніклі затрымкі ў апрацоўцы пошты.**

З 3 снежня паштовую карэспандэнцыю можна адпраўляць, як і раней. Але за час забастоўкі ў Канадзе назбіралася вялікая колькасць не дастаўленых своечасова адпраўленняў. І ў першую чаргу будуць апрацоўвацца менавіта яны. Таму не здзіўляйцеся, калі святочная паштоўка дойдзе да адрасата па той бок Атлантыкі далёка не ў тэрмін.

Акрамя таго, Канада ажыццяўляе транзіт пошты ў невялікія краіны Карыбскага басейна. Таму перабоі могуць назірацца падчас дастаўкі адпраўленняў у такія краіны, як Антыгуа і Барбуда, Багамы, Барбадас, Беліз, Бенін, Бермуды, Венесуэла, Гвадэлупа, Грэнада, Дамініка, Дамініканская Рэспубліка, Кайманавы астравы, Калумбія, Коста-Рыка, Марцініка, Панама, Парагвай, Перу, Сальвадор, Сен-П'ер і Мікелон, Сент-Кітс і Нэвіс, Трынідад і Табага, Уругвай і Ямайка.

**Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**


ОСТРОВ ЧИСТОТЫ

РЕЗУЛЬТАТ РОЗЫГРЫША ЦЕННЫХ ПРИЗОВ СРЕДИ УЧАСТНИКОВ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «СЧАСТЛИВЫЙ СЛУЧАЙ В ОСТРОВЕ ЧИСТОТЫ! ТУР 11»

**1. Сведения об организаторе.**

Общество с ограниченной ответственностью «Торговая компания Ромакс» (далее – Организатор).

УНП 190761848. Зарегистрирован решением Минского горисполкома от 04.10.2006 г. № 2011. Регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей № 190761848.

Местонахождение Организатора: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8.

Почтовый адрес: 220068, г. Минск, ул. Каховская, д. 70А, пом. 8 (5-й этаж).

**2. Наименование Рекламной игры.**

«Счастливый случай в Острове чистоты! Тур 11»

**3. Сроки проведения.** 16.11.2018 – 29.12.2018 (включая период розыгрыша и вручения призов). Розыгрыш призов проведен 6 декабря 2018 года, г. Минск, ул. Сторожовская, 15.

**4. Сведения о государственной регистрации рекламной игры.** Свидетельство № 3421 рекламной игры «Счастливый случай в Острове чистоты! Тур 11», 13 ноября 2018 г. МАРТ Республики Беларусь.

**5. Сведения о количестве участников рекламной игры.** В розыгрыше участвует 198 743 участников игры.

**6. Сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда.** Призовой фонд сформирован за счет имущества и денежных средств Организатора и был разыгран полностью.

**7. Фамилии, инициалы победителей, его выигрыш.**

В ходе розыгрыша определены Игровые коды получателей призов.

**Результаты розыгрыша:**

**Автомобиль «КИА RIO»_FB, Z94C241BAJR078539, РФ стоимостью 26900,00 белорусского рубля и денежное вознаграждение в размере 4001,31 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1685647 | 1865994 | Родионова Татьяна Вениаминовна |

**Кофемашина Philips HD8829/09 стоимостью 924,966 белорусского рубля и денежное вознаграждение в размере 119,99 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1805068 | 1693787 | Анискевич Елена Николаевна |
| 2 | 1625348 | 1286097 | Килевич Ольга Александровна |
| 3 | 1655750 | 1381230 | Канцур Анна Владимировна |
| 4 | 1635218 | 2779222 | Семченко Татьяна Викторовна |
| 5 | 1710824 | 2749197 | Терешко Ирина Владимировна |
| 6 | 1705944 | 2156173 | Куприянчик Алла Егоровна |
| 7 | 1840179 | 3619883 | Кореневская Олеся Олеговна |
| 8 | 1837216 | 2437067 | Звирко Марина Дмитриевна |
| 9 | 1750588 | 1480733 | Буровикова Ирина Геннадьевна |
| 10 | 1722344 | 2016250 | Чернышева Елена Михайловна |

**Мультикухня Redmond RMK-M911 стоимостью 291 белорусского рубля и денежное вознаграждение в размере 25,25 белорусский рубль**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1829976 | 3211594 | Берташ Ольга Николаевна |
| 2 | 1711353 | 2817549 | Климович Валерий Владимирович |
| 3 | 1680512 | 3030620 | Якимкова Ирина Валерьевна |
| 4 | 1749866 | 1423831 | Дамаренок Елена Геннадьевна |
| 5 | 1625795 | 1335698 | Машуто Светлана Ивановна |
| 6 | 1686992 | 2005811 | Абрамович Елена Чеславовна |
| 7 | 1783030 | 3457552 | Шиенок Надежда Михайловна |
| 8 | 1841262 | 2664491 | Железнякова Галина Степановна |
| 9 | 1815257 | 2362597 | Наронская Анна Петровна |
| 10 | 1708518 | 2442970 | Ануфриева Наталья Владимировна |
| 11 | 1748225 | 1300215 | Желудова Ирина Сергеевна |
| 12 | 1771008 | 1557945 | Шейнюк-Старко Наталия Николаевна |
| 13 | 1733886 | 1626747 | Котяш Светлана Викторовна |
| 14 | 1800968 | 2348836 | Паршутович Светлана Романовна |
| 15 | 1684153 | 1649867 | Корнейчук Людмила Николаевна |
| 16 | 1672437 | 1833905 | Комаровская Елена Анатольевна |
| 17 | 1802431 | 2764345 | Старовойтова Ирина Валерьевна |
| 18 | 1771572 | 1622843 | Войтович Татьяна Ивановна |
| 19 | 1741632 | 2479695 | Левкович Екатерина Александровна |
| 20 | 1736798 | 1924638 | Агиевич Ольга Владимировна |

**Денежный приз в размере 300 белорусских рублей и денежное вознаграждение в размере 26,60 белорусского рубля**

| № п/п | № Игрового кода | № Дисконтной карты | Фамилия Имя Отчество |
|---|---|---|---|
| 1 | 1661562 | 2071206 | Смирнова Татьяна Алексеевна |
| 2 | 1819904 | 3365749 | Смолякова Екатерина Александровна |
| 3 | 1735922 | 1839978 | Вахова Вероника Геннадьевна |
| 4 | 1747261 | 3440695 | Карпова Ксения Андреевна |
| 5 | 1778107 | 2424925 | Дербенева Ольга Петровна |
| 6 | 1775531 | 2054629 | Сливец Ольга Александровна |
| 7 | 1722788 | 2079651 | Савельева Влада Игоревна |
| 8 | 1820572 | 1557201 | Чайчиц Крестина Викторовна |
| 9 | 1721635 | 1922108 | Филипсон Юлия Александровна |
| 10 | 1774244 | 1923996 | Белоусова Юлия Анатольевна |
| 11 | 1774302 | 1928720 | Есипович Владислав Владимирович |
| 12 | 1662192 | 2148051 | Дмитренко Вадим Геннадьевич |
| 13 | 1790502 | 2354874 | Арабей Марина Геннадьевна |
| 14 | 1661713 | 2090531 | Шавеко Екатерина Александровна |
| 15 | 1690450 | 2580497 | Конюк Наталья Дмитриевна |
| 16 | 1761080 | 2580337 | Дынкович Людмила Антоновна |
| 17 | 1790491 | 2351019 | Зданевич Татьяна Леонидовна |
| 18 | 1763781 | 2949982 | Петрушенко Алевтина Геннадьевна |
| 19 | 1825665 | 1978916 | Сочивкина Лилия Васильевна |
| 20 | 1822127 | 1336500 | Трубавина Юлия Алексеевна |
| 21 | 1750025 | 1436735 | Кравцова Наталья Евгеньевна |
| 22 | 1644450 | 1918986 | Щепук Андрей Георгиевич |
| 23 | 1781747 | 3088839 | Бегунец Елена Александровна |
| 24 | 1758763 | 2259420 | Качан Кристина Олеговна |
| 25 | 1696928 | 1418972 | Кириенко Елена Владиммровна |
| 26 | 1703667 | 1962997 | Загривина Анна Васильевна |
| 27 | 1791805 | 2737774 | Мойсейчук Ирина Александровна |
| 28 | 1791277 | 2590620 | Бурштын Валентина Ивановна |
| 29 | 1691353 | 2759923 | Зеленко Марина Николаевна |
| 30 | 1699520 | 1630370 | Адамович Оксана Николаевна |

**8. Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры:** (8044) 700-13-33, (8033) 686-37-37 с 09.00 до 21.00, а также на сайте ostrov-chistoty.by

# «ІСТОТЫ, ЗДОЛЬНЫЯ АДЧУВАЦЬ СТРАХ І БОЛЬ»

**Вольга МАЁРАВА пазіцыянуе сябе як заснавальніцу грамадзянскай ініцыятывы «Мы з табой у адным доме». Так называюцца групы ў сацыяльных сетках, якія яна стварыла ў канцы ліпеня і якія налічваюць некалькі соцень удзельнікаў. Вользе Маёравай удалося хутка звярнуць увагу на сваю дзейнасць не толькі беларускіх абаронцаў жывёл, але і замежных. Адным з вынікаў яе дзейнасці стаў зварот да кіраўніка Беларусі 84-гадовай французскай кінаактрысы Брыжыт Бардо з просьбай абараніць бяздомных жывёл у нашай краіне.**


Здымак носіць ілюстрацыйны характар.

Зараз на інтэрнэт-старонках групы збіраюцца подпісы пад петыцыяй, у якой змешчаны патрабаванні аб далучэнні Рэспублікі Беларусь да еўрапейскіх канвенцый, у тым ліку «Канвенцыі па абароне хатніх жывёл»; адмове ад работы над праектам закона «Аб абыходжанні з жывёламі», які быў унесены Саветам Міністраў у Палату прадстаўнікоў у канцы кастрычніка 2015 года; распрацоўцы праекта прынцыпова іншага закона — «Аб абароне жывёл» — пад эгідай Мінпрыроды і рэдакцыі артыкула 137 Грамадзянскага кодэкса Беларусі з тым, каб жывёлы не разглядаліся заканадаўствам у якасці маёмасці. Напярэдадні нашай публікацыі кампанію падтрымала каля 5000 чалавек.

Вольга Маёрава не толькі актыўна выкарыстоўвае інтэрнэт-рэсурсы, яна асабіста сустрэлася з міністрам фінансаў, удзельнічала ў першым ўсебеларускім з'ездзе зоаабаронцаў, дае інтэрв'ю, вядзе перапіску з прадстаўнікамі выканаўчай і заканадаўчай улады. Сустрэча ў Палаце прадстаўнікоў адбылася па ініцыятыве дэпутатаў.

— Мы хацелі б выслухаць пытанні, якія ў вас існуюць, пагаварыць па азначанай тэме, — растлумачыў мэту сустрэчы **старшыня Пастаяннай камісіі па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве Юрый ДАРАГАКУПЕЦ.**

Вольга Маёрава абазначыла сваю пазіцыю наступным чынам: «Мы лічым, што сітуацыя ў зоаабароне настолькі далёка зайшла ў тупік, што выйсці з гэтага тупіка можна толькі вельмі сур'ёзнымі кардынальнымі змяненнямі».

Патрабаванні грамадзянскай кампаніі «Мы з табой у адным доме», сфармуляваныя ў звароце да парламентарыяў, пераклікаюцца з тымі, што ў петыцыі: змена артыкула 137 Грамадзянскага кодэкса; змена дзяржаўнага органа, адказнага за распрацоўку і прыняцце закона, які рэгулюе адносіны ў сферы абыходжання з жывёламі; далучэнне да еўрапейскіх канвенцый па абароне жывёл; удзел спецыялістаў зоаабарончай супольнасці ў працэсах распрацоўкі новага праекта Закона Рэспублікі Беларусь «Аб абароне жывёл» і правядзення ўсіх этапаў рэфармавання заканадаўства Беларусі ў гэтай галіне.

«Мы лічым, што ў выпадку распрацоўкі новага закона мы можам паказаць нашаму грамадству і міжнароднай супольнасці прыклад сумеснай добрай работы», — аргументавала Вольга Маёрава. За мяжой ёсць шмат буйных зоаабарончых арганізацый, якія гатовы дапамагаць нашай краіне, але для гэтага патрэбна палітычная воля, лічыць актывістка. Вольга Маёрава выказала ўпэўненасць, што распрацоўка закона ў гэтай сферы на базе модульных дакументаў СНД бесперспектыўная. «Для нас далучэнне да еўрапейскіх канвенцый — гэта знак цывілізаванасці Беларусі», — безапеляцыйна заявіла яна.

На пытанне дэпутатаў, чым канкрэтна могуць дапамагчы міжнародныя зоаабарончыя арганізацыі, Вольга Маёрава адказала: «Яны могуць праводзіць семінары для валанцёраў і ветэрынараў, могуць правесці праграму стэрылізацыі. Калі яны ўбачаць заканадаўчы рух насустрач, то гэта будзе не разавым мерапрыемствам».

**Мадэльны закон МПА СНД, з якім будзе карэляваца нацыянальны закон, дэкларуе міжнародныя прынцыпы абыходжання з жывёламі, тыя ж «адносіны да жывёл як да істот, якія валодаюць здольнасцю адчуваць, у тым ліку адчуваць страх і боль». Актывістка пагадзілася, што ёй трэба вывучыць гэты дакумент, а наконт артыкула 137 ГК прапанавала правесці ў парламенце круглы стол.**

«На сённяшні дзень закона аб абыходжанні з жывёламі ў Беларусі няма, — удакладніла **старшыня Пастаяннай камісіі па пытаннях экалогіі, прыродакарыстання і чарнобыльскай катастрофы Таццяна КАНАНЧУК.** — Ёсць законапраект, і такіх законапраектаў можа быць некалькі. Вы можаце прапанаваць і накіраваць у Палату прадстаўнікоў свой».

Як толькі такі законапраект паступіць у парламент, будзе створана рабочая група, у якую могуць увайсці і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый, калі будзе такое жаданне ў грамадскасці, дадала дэпутат. «У нас такая практыка ёсць. Напэўна, траціну рабочай групы па распрацоўцы законапраекта «Аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях» складалі члены грамадскіх арганізацый і практыкі», — прывяла прыклад сумеснай работы грамадзянскай супольнасці і заканадаўцаў старшыня камісіі.

У сакавіку 2017 года ў Санкт-Пецярбургу Міжпарламенцкая асамблея дзяржаў — удзельніц СНД прыняла мадэльны закон «Аб адказным абыходжанні з жывёламі» ў новай рэдакцыі. Таццяна Кананчук звярнула ўвагу, што канцэптуальныя палажэнні гэтага закона добра стыкуюцца з адпаведнай еўрапейскай канвенцыяй, і на іх будзе арыентавацца беларускае заканадаўства.

«Што датычыцца міжнароднай дапамогі, то ніякай забароны для практычнай работы няма. У нас ёсць добры вопыт работы і з міжнароднай тэхнічнай дапамогай, можна працаваць праз гранты, бязвыплатную дапамогу... Кірункаў дастаткова. Галоўнае, каб гэта быў канструктыўны дыялог, а не аднабаковыя патрабаванні», — заўважыла Таццяна Кананчук.

Над праектам закона «Аб абыходжанні з жывёламі» таксама працавалі зоаабарончыя арганізацыі, і многія іх заўвагі былі ўлічаныя, нагадаў Юрый Дарагакупец.

«Было праведзена грамадскае абмеркаванне. Пры прапрацоўцы законапраекта паступіла амаль паўтары тысячы зваротаў: меркаванні людзей падзяліліся на два полюсы прыкладна пароўну. Таму нам неабходна знайсці кансэнсус, — сказаў парламентарый. — Пры распрацоўцы законапраекта мы павіны ўлічваць рэаліі жыцця і разумець, ці гатова грамадства да змен».

Законапраект «Аб абыходжанні з жывёламі» адкліканы Саветам Міністраў на дапрацоўку.

Стваральніца грамадзянскай ініцыятывы выказала сумненні наконт таго, што нормы мадэльнага закона СНД і Канвенцыі Еўрапейскага саюза па абароне жывёл ад жорсткага абыходжання стыкуюцца, аднак не змагла гэта аргументаваць. «Практыка — і расійская, і беларуская — адназначна паказвае, што гэта не так», — зноў безапеляцыйна заявіла яна, зноў забыўшы, што ў Беларусі закона яшчэ няма, а значыць, няма і практыкі яго прымянення. Вольга Маёрава таксама прызналася, што не аналізавала мадэльны закон МПА СНД.

— Для мяне маркерам з'яўляецца тое, што мадэльны закон СНД не патрабуе змяніць 137-ы артыкул Грамадзянскага кодэкса Беларусі, згодна з якім жывёлы разглядаюцца як маёмасць, — парыравала яна.

— А што вы скажаце на тое, што французскі Грамадзянскі кодэкс прызнае нерухомай маёмасцю жывёл, якіх уласнік змясціў на зямельны ўчастак для яго абслугоўвання і эксплуатацыі? — спытаў Юрый Дарагакупец.

— Я не ведаю гэтай фармулёўкі. Мне перакладчыца з французскай працытавала іншае: «Жывёлы — гэта істоты, якія валодаюць адчувальнасцю».

Дэпутаты растлумачылі Вользе Маёравай, што беларускі Грамадзянскі кодэкс мае адсылачную норму, згодна з якой абыходжанне з жывёламі рэгулюе адпаведны закон пасля яго прыняцця. Мадэльны закон МПА СНД, з якім будзе карэляваца нацыянальны закон, дэкларуе міжнародныя прынцыпы абыходжання з жывёламі, тыя ж «адносіны да жывёл як да істот, якія валодаюць здольнасцю адчуваць, у тым ліку адчуваць страх і боль». Актывістка пагадзілася, што ёй трэба вывучыць гэты дакумент, а наконт артыкула 137 ГК прапанавала правесці ў парламенце круглы стол.

Прадстаўнікі грамадзянскай ініцыятывы спасаліся на тое, што праграма стэрылізацыі бяздомных жывёл у нашай краіне не была рэалізаваная з-за таго, што, згодна з беларускім заканадаўствам, жывёлы — гэта рэчы, а, маўляў, стэрылізаваць рэчы немагчыма. Тут ужо дэпутаты не ведалі, што адказаць. Яны не чулі пра такую праграму.

У выніку бакі дамовіліся пра магчымасць далейшага супрацоўніцтва пры ўмове захавання цывілізаванага і канструктыўнага дыялогу. «Распрацоўвайце вашы нормы, дасылайце і будзем сустракацца, — прапанавала Таццяна Кананчук. — Каб арганізаваць сустрэчу з удзелам спецыялістаў, якія валодаюць пэўнымі кампетэнцыямі, трэба ведаць прадмет абмеркавання». Гэта датычыцца і патрабавання змяніць артыкул 137 ГК. «Вы згодныя, што яго трэба мяняць?» — спыталі актывісты. «Мы згодныя гэта абмяркоўваць», — удакладнілі заканадаўцы.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Да ведама

Артыкулам 137 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь устаноўлена, што да жывёл прымяняюцца правілы аб маёмасці пастольку, паколькі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам і не вынікае з асаблівасцяў гэтага аб'екта. Пры гэтым пры ажыццяўленні правоў не дапускаецца жорсткае абыходжанне з жывёламі, якое супярэчыць прынцыпам гуманнасці, пракаментавалі згаданую норму ў Палаце прадстаўнікоў.

Як бачна, Кодэкс выкарыстоўвае асцярожную фармулёўку аб прымяненні да жывёл правілаў аб маёмасці тады, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам і не вынікае з асаблівасцяў гэтага аб'екта права. Тым самым грамадзянскае заканадаўства не рашаецца катэгарычна абвясціць жывёл аб'ектамі права ўласнасці, а выкарыстоўвае правілы аб маёмасці за адсутнасцю іншага інструмента.

Такі падыход, які прыраўноўвае жывёл да асаблівых рэчаў, характэрны для ўсіх «традыцыйных» заканадаўстваў. Напрыклад, Грамадзянскі кодэкс Латвіі (арт. 931) называе лясных жывёл «жывымі безгаспадарнымі прадметамі». Французскі Грамадзянскі кодэкс (арт. 522, 524) прызнае нерухомай маёмасцю жывёл, якіх уласнік змясціў на зямельны ўчастак для яго абслугоўвання і эксплуатацыі (жывёлы для апрацоўкі зямлі, рыбы ў вадаёмах, пчаліныя вуллі, галубы ў галубятнях, трусы ў садках і да т. п.).

У заканадаўстве некаторых краін выкарыстоўваецца іншы падыход, які вылучае жывёл з сукупнасці іншай маёмасці і які надзяляе іх асаблівым статусам. Напрыклад, згодна з арт. 135.3 Грамадзянскага кодэкса Азербайджана, «жывёлы не з'яўляюцца рэччу. Іх прававое становішча вызначаецца адмысловымі законамі», пры гэтым купляпродаж жывёл, раслін, рыб захавана, але выдзелена ў асобную разнавіднасць дагавора куплі-продажу (арт. 608—613).

Такім чынам, у Рэспубліцы Беларусь, як і ў многіх краінах свету, незалежна ад падыходу, які выкарыстоўваецца, і тэрміналогіі, якая ўжываецца, да хатніх жывёл прымяняюцца правілы аб маёмасці, жывёлы выступаюць аб'ектамі здзелак. Пры гэтым у заканадаўстве прадугледжана забарона на жорсткае абыходжанне з жывёламі, якое супярэчыць прынцыпам гуманнасці.

Прачытаў — перадай другому *Сумесны праект газеты «Звязда» і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Да 75-годдзя вызвалення 1944 2019

# ШТО ХАВАЛАСЯ Ў КАПУСЦЕ,

## або Як партызанскі і падпольны друк трапляў да чытачоў

*— Неабходна тэрмінова арганізаваць падпольную друкарню і выпуск улётак. Трэба выкрываць гітлераўскіх брахуноў, людзям праўду несці, на барацьбу з акупантамі клікаць. Падумайце, як гэта зрабіць...*

**Такое даручэнне даў сакратар падпольнага абкама Васіль Іванавіч Казлоў у 1941 годзе. Сапраўды акупацыйныя ўлады адразу разгарнулі буйную агітацыйную кампанію. Насельніцтву паведамлялі пра захопленыя Маскву і Ленінград, пра багатыя трафеі нямецкай арміі. Неабходна было даць адпор на ідэалагічнай ніве...**

«Выйшлі мы ад Васіля Іванавіча і задумаліся. У нас не было журналістаў, друкарок, а самае галоўнае — не было шрыфту, — успамінае Аляксандр Сакевіч, былы рэдактар газет «Кліч Радзімы» (якая выдавалася Любанскім падпольным райкамам) і «Минский большевик» (орган Мінскага падпольнага гаркама партыі з верасня 1943 года). — Мясцовыя камуністы паведамілі, што з раённага


ЗАГАД
Прэзыдэнта Беларускай Цэнтральнай Рады
...
Трудящиеся Минска! Знайте, что мобилизация ... ГДЕ ВАС ЗАСТАВЯТ СРАЖАТЬСЯ ЗА КРОВАВОГО ГИТЛЕРА ...
Помните, что мобилизация ЕСТЬ УГОН В НЕМЕЦКОЕ РАБСТВО.
Мужчины! Спасайте свою жизнь, не являйтесь на мобилизационные пункты.
Уходите в партизанские отряды. ...
Прэзыдэнт Беларускай Цэнтральнай Рады
Р. Астроўскі

**Выданне Мінскага гаркама КП(б)Б, замаскіраванае пад «загад прэзідэнта Беларускай цэнтральнай рады». Назва і подпіс пададзены, каб адцягнуць увагу немцаў.**

цэнтра Любань не паспелі эвакуіраваць друкарню газеты. Вырашана было тэрмінова захапіць яе... На другі дзень мы варажылі над трафеем: шрыфты пры дастаўцы былі ссыпаны ў мяхі без разбору. Друкарскай касы ў нас не было, таму шрыфты вырашылі размяшчаць па алфавіце...

Спачатку справа ў нас не клеілася. Набраныя калонкі пры пераносе на вярстальную дошку рассыпаліся, і ўсё даводзілася пачынаць спачатку. Пасля доўгіх намаганняў атрымалася нарэшце звярстаць першую ўлётку. Набор шчыльна ўвязалі шпагатам, нанеслі валікам фарбу, затым, паклаўшы на шрыфт аркуш паперы, працерлі яе з націскам мяккай анучай. Пры такім друкаванні тыраж улётак не мог быць вялікі. За два дні мы змаглі аддрукаваць каля 300 экзэмпляраў памерам у ліст вучнёўскага сшытка...

За тры месяцы працы мы набылі некаторы вопыт выдання ўлётак. З хваёвай кары вырабілі клішыраваныя загалоўкі...»

Менавіта ўлёткі сталі самым распаўсюджаным відам бальшавіцкай друкаванай прапаганды. У розных беларускіх гарадах іх можна было сустрэць ужо з першых дзён вайны. Патрыёты пісалі іх ад рукі ці друкавалі на машынцы, а пасля і наогул стваралі пад носам у фашыстаў. Так, падпольшчыкі Лепеля выдавалі іх у раённай друкарні. Падпольная група дзейнічала і ў Жлобінскай друкарні. Распаўсюджваць улёткі дапамагала моладзь.Тамара Рэмізька была адной з першых сувязных і разведчыц падпольнага райкама камсамола. Яна хадзіла ў Жлобін, ствараючы сабе розны выгляд: то перапраналася ў бабулю, старэнькую, згорбленую, якую за руку вёў «унучак» (малодшы брат), то ў жабрачку (якая міласціну просіць нават у паліцаяў), а то проста ішла ў сваёй лёгкай летняй сукенцы. Яна ведала ўсе явачныя кватэры, прыносіла ў горад улёткі, заданні ад падпольнага райкама камсамола.

Падчас акупацыі ў Хойнікі вярнуўся былы рэдактар мясцовай раёнкі Яўген Казачук і ўладкаваўся загадчыкам друкарні. У хуткім часе на вуліцах горада пачалі з'яўляцца ўлёткі. А калі фашысты выкрылі вінаватых, Яўген Іванавіч сышоў у партызанскі атрад. У жніўні 1943 года з баявым заданнем ён прабраўся ў Хойнікі, здабыў шрыфты для партызанскай друкарні, але, калі вяртаўся ў атрад, натрапіў на засаду і загінуў у баі.

### ІДЭАЛАГІЧНЫ ФРОНТ

Нават маленькая ўлётка ў гады Вялікай Айчыннай вайны магла быць не горшай за зброю. Вядомы выпадкі, калі нумар газеты ці ўлётка заахвочвалі людзей аб'ядняцца ў невялікія групы, а пасля ісці ў партызанскія атрады. Гебітскамісар Слоніма паведамляў у сваім данясенні: «Наша прапаганда слаба арганізаваная, а бальшавіцкая прапаганда пранікае ўсюды. Яна забівае нашу прапаганду. Ёй вераць, і само насельніцтва распаўсюджвае яе».




**Ліст з палону Вольгі Селязнёвай.**

Падпольны і партызанскі друк знаёміў насельніцтва акупаванай тэрыторыі з сапраўдным становішчам на фронце, змяшчаў зводкі Саўінфармбюро і загады, узнімаў на барацьбу, даваў практычныя парады, папярэджваў аб небяспецы і зрываў «мерапрыемствы», якія спрабавалі праводзіць акупацыйныя ўлады. Сярод лістовак багата «адрасных» — зваротаў да пэўнай групы насельніцтва: моладзі, жанчын, сялян, рабочых. Напрыклад, апошніх заклікалі сабатаваць выкананне нямецкіх планаў, зрываць выпуск прадукцыі, псаваць абсталяванне. Моладзь стараліся ўберагчы ад вывазу ў Германію. Так, у адной з улётак, выдадзенай ЦК ЛКСМ Беларусі ў 1942 годзе, друкуецца ліст з палону Вольгі Селязнёвай, вывезенай нямецкімі рабаўласнікамі ў горад Кёльн і прададзенай на рынку нявольнікаў. Беларусам раілі не з'яўляцца на паверку пашпартоў (бо іх могуць прымусова адправіць у Германію), не ісці ў так званыя карпусы самаахвовы (альбо браць там зброю і пераходзіць у партызанскі атрад), не здаваць хлеб. Падпольны друк — часта быў і практычным кіраўніцтвам да дзеяння. «Рабіце на дарогах завалы, перакопвайце глыбокімі равамі, мініруйце, узрывайце масты», — заклікалі ўлёткі. «Разбурайце тыл ворага і яго камунікацыі, падпальвайце масты і чыгункі. Узрывайце і падпальвайце базы, склады з гаручым і боепрыпасамі. Знішчайце тэлефонную і тэлеграфную сувязь. Не дазваляйце фашыстам вывозіць нарабаваную маёмасць і харчаванне ў Германію. Не давайце паліць вёскі», — гэты зварот падпісаны сакратаром ЦК КП (б) Беларусі П. Панамарэнкам, старшынёй Саўнаркама Беларускай ССР І. Былінскім, старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР Н. Наталевічам.

Многія падпольныя і партызанскія друкарні пачыналі сваю работу менавіта з выпуску ўлётак. З верасня 1942 года дзейнічала друкарня партызанскай брыгады «Стары», абсталяванне для якой збіралі «ўсёй грамадой». Шрыфт дала аператыўная група, касу, талер, валікі і іншае выраблялі самі. І першай прадукцыяй у сабранай такім чынам друкарні сталі ўлёткі, у тым ліку і на нямецкай, польскай і славацкай мовах, а пазней тут пачалі ствараць і газеты.

Прапаганда, скіраваная на варожыя гарнізоны, у тым ліку на паліцэйскіх, давала неблагія вынікі. Напрыклад, у Суражскім раёне, як згадваў у сваіх успамінах былы камандзір партызанскага злучэння У. Лабанок, пасля таго, як у паліцэйскі гарнізон былі дасланы партызанскія газеты, у якіх паведамлялася пра разгром фашыстаў пад Сталінградам, 105 чалавек са зброяй і каштоўнымі дакументамі перайшло на бок партызан.

«Кожны паліцэйскі асабіста атрымліваў нашу ўлётку з заклікам адмовіцца ад сабачай службы», — успамінаў Іван Крыскавец (рэдактар падпольнай магілёўскай абласной газеты «За Радзіму»). Як вынік, многія паліцэйскія ўчасткі Клічаўскага раёна партызанам удалося захапіць без крыві і наогул без адзінага стрэлу.

Часам работнікам друкарняў даводзілася мяняць дыслакацыю, газеты і ўлёткі выпускаліся ў баявых паходах. Сакратар мінскага падпольнага абкама КП(б)Б І. Д. Варвашэня ўспамінаў: «Увесь час вандроўны спосаб жыцця вялі. Прыязджаем на новае месца, гадзіны дзве праходзіць — друкарні ўжо набіраюць». Партызаны пашылі маленькія мяшочкі і на кожным вышылі літары: «а», «б» і г. д. Як закончылі набор, мяшочкі — за плечы, і можна пераязджаць на новае месца, дзе зноў будзе набірацца агітпрадукцыя. Дарэчы, улёткі, якія выдаваў Мінскі падпольны абкам, выпускаліся амаль штодзённа і распаўсюджваліся як па Мінскай вобласці, так і за яе межамі.

Калі патрэбнай паперы не хапала, у справу ішла любая — абгортачная, папяросная, нямецкія дакументы, пропускі, карты. У Гродзенскім музеі вы зможаце пабачыць улётку, надрукаваную на бяросце.

### ПА ВАДЗЕ І ПА СУШЫ

Падпольныя газеты і ўлёткі можна было сустрэць на варотах, платах і тэлеграфных слупах, на сценах дамоў і дзвярах нямецкіх камендатур, на чыгуначных вагонах і машынах фашысцкай адміністрацыі. Іх раскідвалі на кірмашах і ў тэатрах, наклейвалі на дошкі аб'яў, часам побач з фашысцкімі газетамі або паверх іх. Каб данесці інфармацыю да чытачоў, журналісты ўжывалі розныя хітрасці. Так, супрацоўнікі «Минского большевика» скапіравалі загаловак загаду ад так званай «Усебеларускай цэнтральнай рады», што развешваўся па ўсім горадзе. Аднойчы патрульныя заўважылі вялікую групу мінчан каля дошкі аб'яў, распіхалі натоўп і задаволена кінулі: «Гут. Загад прэзідэнта рады»... І не звярнулі ўвагу на тое, што надрукавана пад загалоўкам. Улётку немцы сарвалі толькі праз некалькі дзён.

Траплялі газеты і ўлёткі і на службовыя сталы адміністрацыі акупантаў, у лагеры для ваеннапалонных, ваенныя гарнізоны, іх падкідалі нават у кішэні паліцэйскіх.

ЦК КП(б) Беларусі даваў указанні падпольным партыйным арганізацыям і камісарам партызанскіх атрадаў падабраць спецыяльных развозчыкаў літаратуры па населеных пунктах. А ўжо на месцах сувязныя вынаходзілі розныя спосабы «дастаўкі» — у малочных бітонах з падвойным дном, на дне кошыкаў з яйкамі, на падводах у мяхах з зернем, бульбай, у цюках сена ці саломы, у качанах капусты. Газеты і ўлёткі закладваліся ў пустацелую дугу альбо аглоблю сялянскага воза і нават упакоўваліся разам з фашысцкімі газетамі і развозіліся па чыгунцы. Напрыклад, на станцыі Рудзенск у паштовым аддзяленні працавала партызанская сувязная. Па яе ініцыятыве газета «Минский большевик» і ўлёткі пакаваліся разам з нямецкай поштай, якая, як правіла, немцамі не правяралася. У Мінску на вакзале свае людзі прымалі пошту, вымалі партызанскія газеты.

У адной вёсцы Мінскай вобласці, дзе стаяў фашысцкі гарнізон, пошту гаспадарам дастаўлялі... коні. Партызаны лавілі іх на полі, у хвост увязвалі газету і пускалі дахаты ў вёску. Не забываліся партызаны пра работу з насельніцтвам і падчас баявых дзеянняў — выступалі з дакладамі, зачытвалі зводкі Саўінфармбюро, раздавалі друкаваную прадукцыю.

У некаторых населеных пунктах жанчыны і дзеці дзяжурылі на рацэ і вылоўлівалі з вады бутэлькі — так працавала партызанская пошта. Таксама патрыёты размяшчалі газеты і ўлёткі ў тых месцах, куды маглі дайсці сяляне, а фашысты баяліся сунуцца, каб не наткнуцца на засаду — на перакрыжаваннях дарог і на ўзлесках.

У тыле ворага такія «падарункі» вельмі цаніліся, пра што сведчаць успаміны рэдактараў падпольных газет. Селянін вёскі Лыкава Андрэй Казлоў у чэрвені 1943 года перадаў партызанам дзве вінтоўкі, шэсць гранат і 1300 патронаў і ад імя ўсіх жыхароў прасіў для сваёй вёскі прысылаць як мага больш газет і ўлётак. У вёсцы Якубовічы 60-гадовы селянін Пётр Жардзецкі гаварыў партызанам: «Мне вашы газеты і лістоўкі даражэй за ўсё. Калі я дастану газету, то некалькі разоў прачытаю яе сам і потым перадаю суседзям». У сяле Айнаровічы Слабодскага сельсавета да грамадзяніна Канстанціна Стрыгі прынеслі прэсу. Праз некалькі хвілін пра гэта даведалася ўся вёска. Хата Стрыгі перапоўнілася людзьмі. Газету чыталі некалькі разоў. Потым грамадзянін Стрыга гэтую газету даставіў у суседнюю вёску.

Не менш чакалі падпольны друк і ў гарадах. Так, адзін з экзэмпляраў газеты «За Савецкую Беларусь» патрапіў у Мінску на тытунёвую фабрыку, а пасля таго як яго перагледзелі ўсе рабочыя, на наступны дзень быў перададзены на дражджавы завод.

Нягледзячы на небяспеку (за знойдзеную друкаваную прадукцыю фашысты расстрэльвалі), людзі перадавалі газеты і ўлёткі з рук у рукі. Спрацоўвала правіла, напісанае на іх: «Прачытаў — перадай другому».




**Гэту ўлётку можна пабачыць у Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі.**

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 45 (441)

Балет

# ВЕЧНАЯ ГІСТОРЫЯ НА НОВЫ ЛАД

**На гэтым тыдні мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра Беларусі Валянцін Елізар'еў прадставіў публіцы прэм'еру — балет «Рамэа і Джульета» ў новай рэдакцыі. А настроіцца на патрэбны лад першым гледачам дапамагла балетны крытык Святлана Уланоўская, якая перад спектаклем прачытала для ахвотных займальную лекцыю пра гісторыю і адметнасці пастановак розных харэографаў.**


tut.by

...У свой час музыка кампазітара Сяргея Пракоф'ева была ўспрынятая вельмі неадназначна — занадта складаная, арытмічная, яна была для сучаснікаў. Нездарма вядомая балерына Уланава казала: «Няма аповесці сумнейшае на свеце, чым музыка Пракоф'ева ў балеце». І тым не менш першая ў Савецкім Саюзе пастаноўка «Рамэа і Джульеты», якая з'явілася ў 1940-м, стала пэўным эталонам, на які так ці інакш азіраліся ўсе паслядоўнікі, і наогул адным з самых папулярных балетаў XX стагоддзя. Многія вядомыя балетмайстры, ад Юрыя Грыгаровіча да Рудольфа Нурыева, прадставілі сваю інтэрпрэтацыю пракоф'еўскай партытуры ў больш як 80 пастаноўках, якія бачылі гледачы Расіі, Арменіі, Эстоніі, Карэі, Манака, Канады, ЗША, Францыі і іншых краін.

У Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета «Рамэа і Джульету» Валянцін Елізар'еў паставіў яшчэ ў лістападзе 1988-га — і публіка, і крытыкі прынялі пастаноўку з захапленнем, і ўсе гэтыя гады яна не сыходзіла са сцэны. Аднак цяпер народны артыст СССР і Беларусі і лаўрэат Дзяржпрэміі, які гэтай восенню вярнуўся ў тэатр, усё ж рызыкнуў удасканаліць выдатнае і за рэкордна сціслы тэрмін падрыхтаваў новую версію балета. Праўда, ніякіх змен у хрэстаматыйны сюжэт спектакля не ўносіў і не набліжаў да сучаснасці час, месца і герояў дзеі, толькі ўвёў новых выканаўцаў і пэўным чынам скарэктаваў харэаграфію. Партыю Джульеты ў новай версіі выконваюць Людміла Хітрова і Ірына Яромкіна, Рамэа танцуюць Ігар Аношка і Алег Яромкін. Што яшчэ змянілася? «Расказваць балет словамі — няўдзячная справа, — падкрэслівае харэограф-пастаноўшчык, — яго трэба глядзець і прачуць, адчуць сэрцам». Калі ж нехта з тэатралаў не змог трапіць на прэм'еру 5 і 6 снежня, пазначце ў планах: наступным разам балет будзе паказаны 23 студзеня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Прэм'ера

# ПАМІРАЦЬ, ДЫК ПАД РОК

## Тэатральная сцэна стала дарогай у пекла

**Рэпертуар Маладзёжнага тэатра папоўніўся спектаклем-абсурдам пра шлях звычайнага вясковага дзеда — чытай: беларуса — у іншы свет. «І не намі гэта прыдумана» пастаўлена Дзянісам Паршыным па п'есе аднаго з самых прадстаўнічых беларускіх драматургаў Дзмітрыя Багаслаўскага. Па аналогіі з road-movie — асобным кінажанрам, дзе галоўныя героі дзейнічаюць на пэўным шляху, яны стварылі road-play, у якім дзед Нічыпар сыходзіць з вёскі, бо адчувае набліжэнне смерці. Прэм'ера спектакля адбылася 28 лістапада і зараз паказваецца на сцэне Маладзёжнага.**


vminsk.by

Уласна шляхам да смерці, перад якой трэба зрабіць шэраг сімвалічных сустрэч-іспытаў і перасягнуць апошняе і самае галоўнае выпрабаванне — перайсці цераз мяжу з прыгранічнікамі, уяўляецца пастаноўка «І не намі гэта прыдумана».

**Дарэчы, дзеду было весела пакідаць зямное жыццё, здаецца, нават занадта.**

Дзед Нічыпар вырашыў сысці, калі пабачыў сон з яркім святлом у канцы тунэля. Выпраўлялі яго ўсёй вёскай — пырскі алкаголю разляталіся ва ўсе бакі, асобныя персанажы дэманстравалі раздваенне асобы, рэўнасць, камічнасць, а ў выніку дзеда папрасілі вярнуцца і прывезці асфальту.

На шляху да Нічыпара далучылася і баба, якая мае да яго асаблівыя пачуцці, ды яшчэ казу з сабой узяла. Ён сустрэў рабаўніц у стрып-туфлях, якія «пераганялі саплю з наздры ў наздру» і часаліся, ад чаго дзед іх вылечыў травамі. «Пацярашку» — дзёрзкае і невыхаванае дзіця, якое жыве ў лесе і казачнага ўзору рыфмамі просіць хлеба і малака. Ваўка, які нюхае какаін (ці нейкі іншы наркотык) і страляе ў зайцаў, што тут жа ажываюць. Нарэшце, «прыгранічнікаў» — яны, напэўна, адсылаюць да рэальных людзей у форме пры ўездзе ў прыгранічную зону. Але ў спектаклі гэтыя персанажы не надта ветлівыя.

У пастаноўцы, якая з кожным эпізодам працягвае абсурдысцкую лінію, змяшаліся патэрны рамантычных гісторый, казачныя матывы і адсылкі да сапраўдных сучасных з'яў, камедыйнасць, містыка, міф пра святло ў канцы тунэля, нарэшце, форма road-movie.

Праўда, узровень сімвалічнасці і густ абсурднасці засталіся спрэчнымі, хаця, трэба прызнаць, спектакль дазволіў сабе шэраг дарэчных жартаў з вуснаў, напрыклад, кіраўніка сельсавета; пяшчотна суправадзіў дзеда бабай; уплёў ва ўмоўны сюжэт знакі сучаснасці; захапіўся антрапамарфізмам (наданнем чалавечага выгляду) і іранічна адправіў галоўнага героя паміраць пад рок — песню Highway to Hell гурта AC/DC, што перакладаецца як «Шлях у пекла». Дарэчы, дзеду было весела пакідаць зямное жыццё, здаецца, нават занадта.

Пры ўсіх магчымых скідках на абсурд «І не намі гэта прыдумана» засталося незразумелым, што змяшчае ў сабе шлях да смерці, якія іспыты прайшоў галоўны герой і які сэнс у кожным з эпізодаў на яго дарозе (як гэта ні парадаксальна, у абсурдзе як мастацкім метадзе таксама павінен быць сэнс).

**Трэба прызнаць, спектакль дазволіў сабе шэраг дарэчных жартаў з вуснаў, напрыклад, кіраўніка сельсавета.**

Абсурд у гэтым выпадку аказаўся бязлітасным (баюся, з няправільна расстаўленымі акцэнтамі ў рэжысуры), але весёлы выхад у пекла пад песню Highway to Hell — можа, і не найгоршы варыянт.

**Софія ПАЛЯНСКАЯ.**

Дата

# БАТЛЕЙКА НЕ СТАРЭЕ

**Трыццаць пяць гадоў таму выпускнікі Беларускай акадэміі мастацтваў Аляксандр ЛОСЬ і Яўгенія ЛІС вырашылі адрадзіць на Смаргоншчыне старажытны народны тэатр — батлейку. Прычым аднаўленне адбывалася на мясцовым матэрыяле: Аляксандр распытваў старажылаў пра жанр, сюжэты пастановак, асаблівасці рэпертуару мясцовых і заезджых лялькаводаў. І, як ні дзіўна, знаходзіліся знаўцы і прыхільнікі гэтага мастацтва, што расказвалі пра містэрыі, лялек-«шпянькоў», адмысловае музычнае суправаджэнне. У выніку шматлікіх экспедыцый і працы з першакрыніцамі была адроджана першая на Беларусі батлейка.**

Сёння не кожны горад можа пахваліцца наяўнасцю тэатра ці хоць бы тэатральнай студыі. А ў аграгарадку Залессе Смаргонскага раёна існуе народны тэатр «Батлейка». Ды не проста існуе, а мае багаты рэпертуар, падарожнічае, выступае на фэстах, удзельнічае і перамагае ў разнастайных конкурсах. Нават рэгіянальны фестываль лялечных тэатраў «Чароўны свет батлейкі» ладзіцца амаль штогод і збірае амбіцыйных артыстаў тэатральных калектываў з усёй краіны.

Залеская «Батлейка» не проста выжыла ў складаныя часы, але набыла аўтарытэт, пашырыла рэпертуар, стала пляцоўкай для творчых рэжысёрскіх эксперыментаў. Гэта ўдалося зрабіць дзякуючы падтрымцы мясцовых улад, кіраўніцтва дабрачыннага фонду «Паўночныя Афіны М. К. Агінскага» і, безумоўна, неабыякавых жыхароў Залесся.


**Заснавальнік першай на Беларусі батлейкі Алесь ЛОСЬ і Алеся СІВОХІНА — ганаровыя госці імпрэзы.**

Сёлета народны тэатр лялек адсвяткаваў 35-гадовы юбілей: сцэнарый «капусніка» стварыла рэжысёр-пастаноўшчык Таццяна Нясцюрына, а сустрэчу правяла «прымадонна» тэатра Аксана Ліс. Аб тым, што за ўвесь тэрмін існавання тэатр выхаваў свайго гледача, сведчыў аншлаг у глядзельнай зале. На ганаровых месцах акцёры з народу: Аркадзь Губар, Марыя Зянкевіч, Вольга Харкевіч, Ангеліна Кенька, Лілія Мураўская, Аляксей Сыракваш і іншыя. Кожны з іх не за грошы, а дзеля маральнага задавальнення некалькі разоў на тыдзень спяшаецца на рэпетыцыю, ахвяруючы ўласным часам дзеля таго, каб зрабіць жыццё землякоў цікавым, змястоўным, насычаным пазітыўным настроем.


**Лялькаводы народнага тэатра лялек «Батлейка».**

Якасць спектакляў, што ставяцца батлейкай, даўно перарасла правінцыйны ўзровень лялечнага балагана. Пра гэта сведчаць дасягненні: узнагароды міжнароднага фестывалю «Рампа дружбы», абласнога фэсту «Лідскія тэатральныя сустрэчы» ды іншых. У 1988 годзе тэатр быў узнагароджаны дыпломам першай ступені за пастаноўку містычнай драмы «Цар Ірад» рэжысёра Яўгеніі Ліс, а ў 2007-м — за творчы эксперымент і найлепшы аўтарскі твор «Вясковая пацеха» рэжысёра Таццяны Нясцюрынай.

У гонар 35-годдзя быў паказаны лялечны спектакль «Калязварот» зноў жа Таццяны Нясцюрынай, дарэчы, прызнаны найлепшым на IV рэгіянальным фестывалі «Чароўны свет батлейкі».

**Ала КЛЕМЯНОК.**

Ініцыятыва: прыватная думка

# НЕ КАЖЫЦЕ «ОСКАР»

## Нацыянальная кінапрэмія стане кінапрэміяй «Беларусьфільма»?

**На нашай культурнай прасторы з'явілася новая ініцыятыва — уручэнне Нацыянальнай кінапрэміі Беларусі. Міністэрства культуры і Мінгарвыканкам вырашылі падтрымаць айчынных кінавытворцаў і ў Дзень беларускага кіно, які адзначаецца 17 снежня, узнагародзіць найлепшых, стварыўшы такім чынам пэўны беларускі аналаг «Оскара». Праўда, прэмія яшчэ не ўручана, а ўжо здаецца, што гэта якраз той выпадак, калі добрымі намерамі выбрукавана дарога... невядома куды. Бо ўжо зараз відаць, што ўвага сканцэнтравана не на нацыянальным кіно, а на работах адной вядучай кінастудыі, прысутнічае паняцце «канфлікт інтарэсаў», а спіс намінантаў можна абазначыць як прадказальныя прыярытэты.**

Нацыянальная кінапрэмія, падобна, будзе выглядаць менавіта так — якая карціна «Беларусьфільма» 17 снежня атрымае статуэтку быццам своеасаблівую «гарантыю якасці». Адзначу, што кінастудыя з'яўляецца як адным з арганізатараў беларускага «Оскара», так і самым папулярным у ім намінантам.

Гэтымі днямі журы, у склад якога ўвайшлі, як гаворыцца ва ўстаноўчых дакументах, «прафесіяналы у сферы кінематографа», вызначае пераможцаў ажно ў дваццаці намінацыях: на цырымоніі ўзнагароджвання павінны быць названы «Найлепшы фільм у ігравой форме», «Найлепшы тэлесерыял», «Найлепшы фільм у неігравой форме», «Найлепшы фільм у анімацыйнай форме», найлепшыя мужчынскія і жаночыя ролі першага і другога планаў, будуць адзначаны «Найлепшая аператарская работа», «Найлепшы мантаж», «Найлепшы сцэнарый» і гэтак далей. Апроч тых «найлепшых» журы вызначыць, каму будуць уручаны статуэткі "За вялікі ўклад у беларускі кінематограф" і «За вялікі ўклад беларускіх кінематаграфістаў у замежны кінематограф».

Выбар будучых уладальнікаў статуэтак праходзіць у два этапы. Спачатку з тых заявак, што фільммейкеры падалі арганізатарам, было адабрана па пяць намінантаў (асобна складаліся спісы тых, хто зрабіў «вялікі ўклад»). Цяпер да 10 снежня перад журы стаіць задача вызначыць пераможцу ў кожнай намінацыі. Ну і ўласна 17 снежня ў Доме кіно працэс увянчаецца цырымоніяй узнагароджвання.

Спіс намінаваных стаў вядомы некалькі дзён таму, і побач з ім пафас выразу «Нацыянальная кінапрэмія стане сапраўдным «беларускім «Оскарам» выглядае даволі недарэчным. Лідарам па колькасці намінацый стала беларусьфільмаўская карціна «Сляды на вадзе» Аляксандра Анісімава — той самы шматпакутны праект, адзіны ігравы фільм, які Нацыянальная кінастудыя зняла ў 2016 годзе і прысвяціла стагоддзю беларускай міліцыі. За ім усё яшчэ цягнуцца пытанні па растраце «Беларусьфільмам» грошай і па ўласна мастацкай якасці таннага баевіка з дрэнна прапісанай матывацыяй і непераканаўчай пастаноўкай.

**Тое, што пакуль вымалёўваецца з высакароднай ініцыятывы, наўрад ці здольна прастымуляваць развіццё айчыннага кінематографа.**

У намінантах часта фігуруе навела Ігара Васільева «Фота на памяць», знятая для альманаха «Вайна. Застацца чалавекам», і гэтым чарговы раз паказвае наша своеасаблівае разуменне (ці неразуменне?) паняцця «канфлікт інтарэсаў». Іншыя навелы пра вайну сярод намінантаў не значацца, хоць «Фота на памяць», можа, і не найлепшая кароткаметражка зборніка. Чым выклікана такая цікавасць да сярэдняй карціны — зразумець складана, але вядома ж, не тым, што бацька рэжысёра Віктар Васільеў з'яўляецца старшынёй Беларускага саюза кінематаграфістаў, аднаго з арганізатараў Нацыянальнай кінапрэміі...



У цэлым паміж арганізатарамі і намінантамі назіраецца настолькі недапушчальная колькасць супадзенняў, што ставіцца сур'ёзна да прэміі, якая гучна называецца нацыянальнай, а абарочваецца міжсабойчыкам датычных інстытуцый, становіцца даволі складана.

Па логіцы і паводле досведу правядзення падобных мерапрыемстваў «Беларусьфільм», Беларускі саюз кінематаграфістаў і Беларуская гільдыя акцёраў кіно не могуць удзельнічаць у арганізацыі прэміі, калі іх прадукт і члены фігуруюць у ліку намінантаў. Але спіс намінантаў чарговы раз падкрэсліў, што ў нас па-ранейшаму — гэта датычыцца і фінансавання, і арганізацыі паказаў за мяжой, і ўзнагарод — галоўным кінагульцом з'яўляецца «Беларусьфільм». Але беларускае кіно ім далёка не абмяжоўваецца, не кажучы ўжо пра тое, што прадукт кінастудыі часта саступае вынікам працы незалежных рэжысёраў. На званне «найлепшага фільма ў ігравой форме» прэтэндуе тры карціны Нацыянальнай кінастудыі — ужо названыя «Сляды на вадзе», «Тумпабі-дум» Вячаслава Нікіфарава і раскрытыкаваная прафесіяналамі «Не гульня»...

Сярод намінаваных серыялаў — прадукт, дзе паспрабуй знайдзі беларускі след апроч таго, што пляцоўка для здымак была арандавана на «Беларусьфільме», а ў эпізодах задзейнічаны айчынныя акцёры. На статуэтку прэтэндуюць, напрыклад, «Снайпер. Афіцэр СМЕРШ», «Мухтар. Новы след», «Вокны дома твайго» — праекты фармату расійскіх тэлеканалаў.

Адным з лідараў па намінацыях з'яўляецца і псіхалагічны трылер «Унутры сябе» — незалежны праект рэжысёра Сяргея Талыбава, які сведчыць, што ў краіне ёсць камерцыйнае кіно, хоць сам фільм — прыгладжаны і холадна шаблонны — усяго толькі чарговы, нічым не выдатны жанравы праект.

Ужо згаданы Віктар Васільеў аказаўся ў намінацыі (і не толькі гэтай) «Найлепшая галоўная мужчынская роля» за ігру ў серыяле «Мухтар. Новы след», а ў пэўных спісах перамяшаліся ігравыя карціны, серыялы, кароткаметражкі, дакументалістыка і анімацыя, што зноў жа выкрывае сціпласць беларускага кінематографа, бо па сутнасці параўноўваць сцэнарый ці рэжысуру дакументальнага фільма і ігравога недарэчна: яны працуюць па розных правілах.

Затое 17 снежня мы даведаемся імёны тых, хто, на думку журы, зрабіў найвялікшы ўнёсак у беларускі і замежны кінематограф. У першай намінацыі фігуруюць класікі Валерый Рыбараў і Міхаіл Пташук, дакументалісты Галіна Адамовіч і Віктар Аслюк, акцёр і рэжысёр Уладзімір Паначэўны, рэжысёр Вячаслаў Нікіфараў, той жа Віктар Васільеў ды іншыя. Класік Віктар Тураў, гукарэжысёр Уладзімір Галаўніцкі, акцёр Уладзімір Гасцюхін, аніматары Міхаіл Тумеля і Алена Пяткевіч, Вячаслаў Нікіфараў ды іншыя могуць атрымаць кінапрэмію за ўклад у замежны кінематограф.

На жаль, спіс намінантаў не стварае поўнага вобраза сучаснага беларускага кіно ці хоць бы прэтэнзіі на яго. У такога непераканаўчага складу прэтэндэнтаў на статуэтку з крэнам у бок Нацыянальнай кінастудыі можа быць шмат прычын: напрыклад, як стала вядома, некаторыя незалежныя аўтары проста не ведалі пра новую магчымасць і прапусцілі тэрміны падачы заявак (значыць, пытанне ў данясенні інфармацыі да кінасупольнасці), фільммейкеры маглі проста праігнараваць новую невядомую прэмію...

Мы не саспелі для свайго «Оскара»: такая ініцыятыва павінна немінуча выкрыць, наколькі кволы сёння наш кінематограф. Магчыма, для пачатку варта было б задумацца аб спрыяльных умовах для яго развіцця, каб стваралася больш карцін, вартых статуэтак. Але Нацыянальную кінапрэмію, калі яна ўжо арганізавана, дакладна можна было зрабіць прэстыжнай, сапраўды ахапіўшы ўвесь пласт сучасных беларускіх фільмаў.

**Кінастудыя з'яўляецца як адным з арганізатараў беларускага «Оскара», так і самым папулярным у ім намінантам.**

Тым не менш тое, што пакуль вымалёўваецца з высакароднай ініцыятывы, наўрад ці здольна прастымуляваць развіццё айчыннага кінематографа — яно хутчэй нагадае пра «манаполію» «Беларусьфільма», падкрэсліць падзел на «залежных» і «незалежных» вытворцаў ды прадэманструе слабасць нашай кінаіндустрыі. І так, зноў паставіць пад сумненне імідж Нацыянальнай кінастудыі, прадукт якой незалежна ад якасці прасоўваецца з нагоды і без...

Так што лепш не спяшацца казаць «беларускі «Оскар»: пакуль што добрымі намерамі дарога беларускага кіно выбрукавана дакладна не ў рай.

Кінакрокі

# Адно з тысяч імёнаў Беларусі,

## або Без каго мы не паляцелі б у космас

**Студыя гістарычных фільмаў «Майстэрня Уладзіміра Бокуна» працягвае сваю асветніцкую дзейнасць і прадстаўляе новы фільм, прысвечаны значнаму, але, напэўна, крыху забытаму ўраджэнцу Беларусі Зыгмунту Урублеўскаму. Таму самаму фізіку, хіміку і навукоўцу, які ў XIX стагоддзі зрабіў немагчымае — насуперак перасцярогам, рызыкам і Майклу Фарадэю з яго «пастаяннымі газамі» атрымаў вадкі кісларод. Прэм'ера карціны адбылася 4 снежня ў velcom cinema Silver Screen.**

Фільм «Зыгмунт Урублеўскі. Гарачы кісларод» прадстаўляе сабой, можна сказаць, гістарычную рэканструкцыю, заключаную ў пачатку і канцы ў каментары сучасных навукоўцаў і даследчыкаў — гульню ў XIX стагоддзе і жыццё Зыгмунта Урублеўскага, пачынаючы з яго студавання/асіставання ў Германіі. У сваёй асноўнай частцы ён пазбавіўся закадравага голасу і каментарыяў на камеру, аддаўшы перавагу ігравому фармату, але такога роду інфармаванне замяніў цытаваннем лістоў Урублеўскага і Урублеўскаму.

Вядомы вынаходнік нарадзіўся ў Гродне і васямнаццацігадовым паўдзельнічаў у паўстанні 1863—1864 гадоў, пасля якога доўга знаходзіўся пад наглядам, а калі вызваліўся ад яго — з'ехаў працягваць вучобу ў Германію. Добрыя, у прыватнасці ў фінансавым плане, часіны для яго наступілі з пераездам у Кракаў, дзе працу і лабараторыю Урублеўскаму прапанаваў Ягелонскі ўніверсітэт. Уласна тут ён сустрэў свайго калегу Караля Станіслава Альшэўскага і пачаў вопыты па атрыманні вадкага кіслароду, якія ў выніку ўвянчаліся поспехам. Навуковы хэпі-энд прыйшоў поруч з трагедыяй жыцця — Зыгмунт Урублеўскі, можна сказаць, пацярпеў ад працы і памёр ад заражэння крыві пасля ўзгарання ў сваім кабінеце.

Уласна такі ракурс — вялікія вынаходствы на карысць чалавецтва праз ахвяраванне ўласным здароўем і нават жыццём — выбралі аўтары гістарычнага фільма, якія праз усю карціну працягнулі лейтматыў небяспекі доследаў і працы з рэчывамі для вачэй прафесара. Сустрэчы з афтальмолагам, расфокус і рэакцыя персанажа на яркае святло даюць зразумець, што галоўны герой заняты толькі ідэяй здабыць вадкі кісларод. Нават адразу пасля выбуху прафесар апантаны сваёй мэтай, а гэта дакладна правакуе ўзнікненне да яго сімпатыі і прыводзіць да поспеху. Уласна, дзякуючы адкрыццю вадкага кіслароду чалавецтва сёння можа запускаць касмічныя ракеты, замарожваць жывыя тканкі і выкарыстоўваць рэчыва ў медыцыне і прамысловасці.

У выніку ўсё, што трэба, каб успомніць і адкласці ў памяці імя Зыгмунта Урублеўскага, заключаецца ў кампліментарным пра яго апавяданні, дзе ў персанажа вельмі высакародныя манеры і ўчынкі, узважаныя і разумныя адказы пра навуку, цёплая перапіска з роднымі і, канешне, апантанасць эксперыментамі на шкоду свайму здароўю.

Аўтарамі сцэнарыя карціны сталі Уладзімір Бокун і Анжаліка Новікава, рэжысёрам — Аляксей Макаранка. Ролю Урублеўскага выканаў Андрэй Новік, пана Альшэўскага сыграў Дзмітрый Якубовіч, а афтальмолага — Ігар Пятроў. Дарэчы, у здымках задзейнічаны прыборы, якімі насамрэч карыстаўся вядомы хімік.

Карціны і, канешне, не ідэальны, але ў пэўным сэнсе важны фільм уяўляецца для нас адной з нямногіх ініцыятыў па вяртанні знакавых імёнаў з Беларусі ў грамадскую свядомасць. «Майстэрні Уладзіміра Бокуна» ўдалося, з аднаго боку, шмат, а з іншага — кіно з асветніцкімі матывамі краіне трэба больш, прычым з часам хай бы пазбаўленага шурпатасці (найгранасць, выкарыстанне шаблонаў і залішняя кампліментарнасць фільма «Зыгмунт Урублеўскі. Гарачы кісларод» прымушаюць увесь час аб іх спатыкацца, хоць, прымаючы правілы гульні, фільм можна паглядзець гладка). На яе рахунку серыя гістарычных работ «Адваротны адлік» (а гэта каля 350 карцін), чатыры фільмы пра Мінскае гета і цыкл «100 імёнаў Беларусі», у якім ужо асветлены, напрыклад, Уладзімір Мулявін («Пясняр. Сэрцам і думамі») ці Ігнат Дамейка («Ігнат Дамейка. Доўгае вяртанне») — усяго пакуль што восем работ.

Такім чынам, вось наша асветніцкае кіно, а вось Зыгмунт Урублеўскі ў ім. Фільм пра вядомага навукоўца будзе паказваца на вялікім экране ў velcom cinema Silver Screen з 10 да 12 снежня.

**Матэрыялы падрыхтавала Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

## ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении вторых повторных торгов в форме аукциона по продаже комплекса объектов недвижимого имущества ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга « КБСТ-Холдинг», находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства)

***Дата и время проведения торгов***: **27 декабря 2018 года.** Начало – 10.00. Заявки принимаются с 8 декабря 2018 года по 26 декабря 2018 года.

***Место проведения торгов:*** Минск, пр-т Победителей, 31-1, конференц-зал ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036), 223060, Минская область, Минский район, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41, тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:* ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга «КБСТ-Холдинг»** (УНП 690595242) в лице антикризисного управляющего частного унитарного предприятия по оказанию услуг «Управление Право Бизнес». тел. 8 (029) 6644589.

| № лота | | Предмет торгов | Начальная цена, руб., в том числе НДС по ставке 20 % | Шаг торгов | Задаток |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1 | Производственно-складское здание со встроенными блоками административно-бытовых помещений (1-я очередь строительства, 1-й пусковой комплекс) (капитальное строение с инв. № 600/С-147497), общая площадь 4 020,1 кв. м, в том числе | 4 099 200 (в том числе НДС 683 200,00 руб.) | 5 % | 2 % |
| | 1.1 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93963,расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-101, назначение – складское помещение, общая площадь 83 кв. м | 102 480,00 (в том числе НДС 17 080,00 руб.) | | |
| | 1.2 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93964,расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-102, назначение – производственное помещение, общая площадь 456,6 кв. м | 486 360,00 (в том числе НДС 81 060,00 руб.) | | |
| | 1.3 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93966, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-103, назначение – складское помещение, общая площадь 48,5 кв. м | 61 404,00 (в том числе НДС 10 234,00 руб.) | | |
| | 1.4 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93967, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-104, назначение – складское помещение, общая площадь 141,4 кв. м | 170 520,00 (в том числе НДС 28 420,00 руб.) | | |
| | 1.5 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93968,расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-105, назначение – производственное помещение, общая площадь 167,7 кв. м | 198 240,00 (в том числе НДС 33 040,00 руб.) | | |
| | 1.6 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93969,расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-106, назначение – производственное помещение, общая площадь 84,2 кв. м | 104 160,00 (в том числе НДС 17 360,00 руб.) | | |
| | 1.7 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93970, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-107, назначение – помещение многофункциональное, общая площадь 194,3 кв. м | 225 120,00 (в том числе НДС 37 520,00 руб.) | | |
| | 1.8 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93971, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-201, назначение – помещение общественного питания, общая площадь 23,7 кв. м | 32 340,00 (в том числе НДС 5 390,00 руб.) | | |
| | 1.9 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93972, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-202, назначение – помещение санитарно-бытового назначения, общая площадь 21,9 кв. м | 29 904,00 (в том числе НДС 4 984,00 руб.) | | |
| | 1.10 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93973, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-205, назначение – административное помещение, общая площадь 71,2 кв. м | 93 240,00 (в том числе НДС 15 540,00 руб.) | | |
| | 1.11 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93974, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-206, назначение – производственное помещение, общая площадь 133,2 кв. м | 164 640,00 (в том числе НДС 27 440,00 руб.) | | |
| | 1.12 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93975,расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-208,назначение – производственное помещение, общая площадь 145,7 кв. м | 178 920,00 (в том числе НДС 29 820,00 руб.) | | |
| | 1.13 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93976, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-212, назначение – производственное помещение, общая площадь 254,4 кв. м | 289 380,00 (в том числе НДС 48 230,00 руб.) | | |
| | 1.14 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93977, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-215, назначение – складское помещение, общая площадь 216,1 кв. м | 248 640,00 (в том числе НДС 41 440,00 руб.) | | |
| | 1.15 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93978,расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-220, назначение – помещение санитарно-бытового назначения, общая площадь 47,2 кв. м | 63 252,00 (в том числе НДС 10 542,00 руб.) | | |
| | 1.16 | Изолированное помещение инв. № 600/D-93979, расположенное по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17-301, назначение – административное помещение, общая площадь 1360,4 кв. м | 1 650 600,00 (в том числе НДС 275 100,00 руб.) | | |
| | 2 | Котельная со складом твердого топлива с установленным оборудованием с инв. № 600/С-147503, расположенная по адресу: Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, 17/1, назначение – сооружение специализированное энергетики, общая площадь 221,3 кв.м, в том числе | 184 800,00 (в том числе НДС 30 800,00 руб.) | | |
| | 2.1 | Водоподготовительная установка Eurosoft E91 DWZ 40 фирмы» BWT «Польша» – 1 ед. | | | |
| | 2.2 | Насос подпиточный CRI – 4 3F фирмы GRUNDFOS – 2 ед. | | | |
| | 2.3 | Бак расширительный NG 100/6 фирмы Reflex – 1 ед. | | | |
| | 2.4 | Теплообменник пластинчатый тепловой сети P-0,25-30.25-2х (300AA+30AA) фирмы «Термоблок» – 1 ед. | | | |
| | 2.5 | Гидрофор DE60/10 фирмы Reflex – 1 ед. | | | |
| | 2.6 | Вертикальный емкостный водонагреватель Logalux SU750 фирмы Buderus – 2 ед. | | | |
| | 2.7 | Насос котлового контура TP40-60/2 3F фирмы GRUNDFOS – 2 ед. | | | |
| | 2.8 | Насос сетевой системы теплоснабжения TRE 80-210/2-S 3F фирмы GRUNDFOS – 2 ед. | | | |
| | 2.9 | Насос циркуляционный горячего водоснабжения UPS 25-80B 1F фирмы GRUNDFOS – 1 ед. | | | |
| | 2.10 | Насос загрузки бойлера сдвоенный TPD 40-120/2 3F фирмы GRUNDFOS – 1 ед. | | | |
| | 2.11 | Чугунный водогрейный газовый котел LOGANO GE 51 фирмы Buderus – 2 ед. | | | |
| | 2.12 | Чугунный водогрейный твердотопливный котел KWH-300 фирмы Hameh – 2 ед. | | | |
| | 2.13 | Бак расширительный NG 600/6 фирмы Reflex– 2 ед. | | | |
| | 2.14 | Электрический шкаф ЩО №14-73 IP54 – 1 ед. | | | |
| | 2.15 | Электрический шкаф ЩО №14-73 IP54 – 1 ед. | | | |
| | 2.16 | Электрический шкаф ВРУ-1 (ВУ) – 1 ед. | | | |
| | 2.17 | Электрический шкаф Щ-81 (РУ-1) – 1 ед. | | | |
| | 2.18 | Электрический шкаф (РУ-2) – 1 ед. | | | |
| | 2.19 | Электрический шкаф ЩК №106 IP21– 1 ед. | | | |
| | 2.20 | Система трубопроводов с клапанами и запорной арматурой | | | |
| | 2.21 | Термовентилятор YWF 4E-350BC фирмы «Тепломаш» – 1 ед. | | | |
| | 2.22 | Горелка газовая MG 10/1 фирмы Giersch с газовым котлом XEV 300 1 – 1 ед. | | | |
